ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б, ГАРСОВЕТА І ГАРПРАФСОВЕТА.

СНЕЖАНЬ 29 1933 г. ПЯТНІЦА № 300

Год выдання XVII.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПРЫВІТАННЕ АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМА ЦК і ЦКК КП(б)Б—ЦК ВКП(б)—тав. СТАЛІНУ.
ДЭЛЕГАЦЫЯ КАЛГАСНІКАЎ Днепрапятроўскай вобласці на прыёме ў тт. Сталіна і Кагановіча.
АБ ХОДЗЕ СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ ПАРТОРГАНАЎ ПА ГОЛКАВАЙ ФАБРЫЦЫ І Ў БЕЛУЦІЛЕ Пастанова бюро Гаркома КП(б Б.
АРТЫКУЛЫ: Перадавы—Гарадскую партыйную канферэнцыю сустрэць рапартамі перамог
ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ: У Старым селе ільназагатоўкі па-ранейшаму злачынна зрываюцца, на сігналы друку не рэагуюць.
Старонка № 4 фабрыкі „КІМ".
ЗА ГРАНІЦАЙ: Па ўсёй Францыі працягваецца кампанія за вызваленне тт. ДЗІМІТРАВА, ТОРГЛЕРА, ПАПОВА і ТАНЕВА.

III ГАРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ВІЦЕБСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ КП(б)Б СКЛІКАЕЦЦА 8 СТУДЗЕНЯ 1934 Г.

ПАРАДАК ДНЯ КАНФЕРЭНЦЫІ:

1. Даклад ЦК КП(б)Б, 2. Даклад ЦКК КП(б)Б, 3. Справаздача ГК КП(б)Б (т. ЖУРАЎЛЁЎ), 4. Даклад рэўкамісіі ГК КП(б)Б (т. ВІГДЭРГАУЗ), 5. Справаздача гарКК КП(б)Б (т. АВЕРЫН), 6. Аб ходзе выканання рашэння ЦК ВКП(б) аб палітаддзелах на транспарце і дапамозе ім у рабоце (тт. ВАСІЛЬКОЎСКІ і БАШМАЧНІКАЎ), 7. Выбары ГК КП(б)Б рэўкамісіі і гарКК КП(б)Б, 8. Выбары дэлегатаў на XV з'езд КП(б)Б.

Канферэнцыя адкрываецца а 18 гадзіне ўвечары, у Белдзяржтэатры (плац Леніна).

Выдача мандатаў і запрашальных білетаў для партактыва будзе вытварацца з 5 студзеня 1934 г. у ГК КП(б)Б ад 12 да 16 гадз. (малая зала ГК КП(б)Б).

ГК КП(б)Б

Гарадскую партыйную канферэнцыю сустрэць рапартамі перамог.

Да агульна-гарадской партыйнай канферэнцыі засталіся літаральна лічаныя дні. 8 студзеня, згодна пастановы гарадскога камітэта партыі, склікаецца трэцяя гарадская канферэнцыя Віцебскай арганізацыі КП(б)Б

Застаўшыяся дні, кожную літараль на гадзіну застаўшыхся дзён, трэба скарыстаць так, каб найлепш падрыхтавацца і сустрэць партыйную канферэнцыю канкрэтнымі большэвіцкімі справамі барацьбы за прамфінплан, за арганізацыйна-гаспадарчае замацаванне калгасаў.

Ва ўсёй нашай арганізацыі разгорнутым фронтам праходзіць зараз справаздачна-перавыбарчая кампанія партыйных органаў. Гэту кампанію трэба ператварыць у магутны сродак барацьбы за поўнае стопроцантнае і высокаякаснае выкананне прамфінплана.

Аўладаць тэхнікай вытворчасці, поўнасцю асвоіць новыя фабрыкі і заводы і на гэтай аснове ўзняць якасць прадукцыі, знізіць сабекошт, павялічыць прадукцыю лёгкай прамысловасці дзўшы высокую якасць тавараў шырспажыва, дабіцца далейшых перамог у ажыццяўленні лозунга т. Сталіна—зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, усіх калгаснікаў заможнымі, па-большэвіцку падрыхтавацца да веснавой сяўбы—вось тыя задачы якія вызначыў снежаньскі пленум ЦК КП(б)Б.

Там, дзе па-большэвіцку разгарнулі падрыхтоўчую работу да гарадской партыйнай канферэнцыі, з'ездаў партыі і справаздачна-перавыбарчай кампаніі партыйных органаў—перамогі ў наяўнасці.

Датэрміновым выкананнем прамфінплана рапартуюць рабочыя алейнага завода.

Значна падцягнуліся за апошні час асобныя ўчасткі на фабрыцы «Профінтэрн»: ударнікі леіты № 10 па сапраўднаму ўзяліся за напружаную работу і большэвіцкімі метадамі працы выйшлі ў перадавыя. 107—110—вось процант выканання плана лентай па колькасных паказчыках. Не адстаюць ударнікі гэтай ленты і па якасці—брак 0,28 замест 1 проц па плану.

ФАНЕРНЫ і АЛЕЙНЫ заводы—гэтыя перадавікі занялі месца на чырвонай дошцы арганізаваннай на старонках нашай газеты ў парадку падрыхтоўкі да XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б).

Але з ўсёй рашучасцю трэба адзначыць, што ўдарныя большэвіцкія тэмпы работы гэтых перадавікоў не сталі здабыткам астатніх прадпрыемстваў Віцебска. Рад буйнейшых фабрык і заводаў працягваюць ганебна цягнуцца у глыбокім тыле (фабрыка „Сцяг індустрыялізацыі", «КІМ», завод «Чырвоны металіст»).

Гэта тлумачыцца тым, што на гэтых прадпрыемствах не было сапраўды большэвіцкай мабілізацыі сіл на поўнае ажыццяўленне пастановы бюро ЦК КП(б)Б аб становішчы віцебскай парторганізацыі, а таксама за рэаліз цыю пастаноў правяркомаў па чыстцы.

Гніла-ліберальныя прымірэнчыя адносіны да антыпартыйных паступкаў, імкненне замазаць, абыйсці, „вырашыць" па сямейнаму сур'ёзнейшыя палітычныя справы—гэта зло не вытручана яшчэ і да сёнешняга дня з практыкі кіраўніцтва партыйнай ячэйкі асветнікаў, трамвая, саюзтранса, і з боку кіраўніцтва некаторых іншых прадпрыемстваў і ўстаноў.

Справаздачна-перавыбарчы сход па лямецкай фабрыцы служыць паказальнікам таго, што кіраўніцтва партыйнай ячэйкі гэтага прадпрыемства крытыку і самакрытыку і ўнутры партыйную дэмакратыю разумее, як некі „прымусовы асортымент", а не як магутнейшы і вастрэйшы сродак барацьбы за сацыялістычнае будаўніцтва. Сакратар партыйнай ячэйкі лямецкай фабрыкі тав. Іваноў пад прадлогам таго, што ён быццам „не падрыхтаваўся"—змазаў справаздачны даклад зрабіў, яго вузкалобая дзеляцкі размяняўшыся на дробязі не ўзняўшы ніводнага сур'ёзнага пытання на належную прынцыпова-палітычную вышыню.

«Пленум ЦК патрабуе, каб як падрыхтоўка да правядзення перавыбараў, так і самі перавыбары суправаджаліся самай жорсткай крытыкай сваіх недахопаў выяўленых і выяўляемых як у працэсе работы, так і чысткай радоў партарганізацыі, не забываючы, што на аснове ажыццяўлення большэвіцкай самакрытыкі сваіх недахопаў, ліквідацыі недахопаў, адзначаных пры чыстцы—партыйныя арганізацыі яшчэ больш умацуюць свае рады».

Асаблівая ўвага кожнай партыйнай ячэйкі, кожнага комуніста павінна быць завострана на пытаннях непрымірымай барацьбы за ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі, за пралетарскае інтэрнацыянальнае выхаванне, за павышэнне большэвіцкай пільнасці і баяздольнасці ў барацьбе на два фронты выходзячы з устаноўкі снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б «што у маштабе ўсяго Совецкага саюза і ўсёй ВКП(б) галоўнай небяспекай па ранейшаму застаецца вялікадзяржаўны рускі шавінізм, разам з тым пленум падкрэслівае, што гэта ні у якай меры не супярэчыць таму, што у БССР як і на Украіне на сёнешнім этапе галоўную небяспеку ў нацыянальным пытанні прадстаўляе мясцовы нацыяналізм які змыкаецца з імперыялістычнымі інтэрвентамі».

Грубай палітычнай памылкай кіраўніцтва асобных партыйных ячэек: (голкавая фабрыка, белуціль трамвай, саюзтранс), з'яўляецца тое, што тут да гэтага часу масава не распрацавалі пастаноў пленумаў ЦК КП(б)Б і ЦК КП(б)У, не завострылі на канкрэтных фактах рэволюцыйнай пільнасці мас, не ўзнялі іх на барацьбу за пролетарскі інтэрнацыяналізм, за ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі і гэтым самым праявілі палітычную недаацэнку ўсёй выключнай важнасці пастаноў снежаньскага пленума ЦК.

Неабходна прыцягнуць да самага актыўнага ўдзела ў правядзенні справаздачна перавыбарчай кампаніі членаў правяркомаў па чыстцы ячэек і калектываў, між тым, у частцы ячэек гэта і дагэтуль не ўлічана (на фабрыцы імя Лекерта, палітэхніку ме трамвай).

Да сканчэння справаздачна-перавыбарчай кампаніі засталося вельмі мала часу. Гэты час трэба скарыстаць так, каб не трацячы ніводнай мінуты дарэмна—найлепш, па-ударнаму, па-большэвіцку на высокім палітычным узроўні правесці перавыбары.

Апублікаваная ў учарашнім нумары газеты пастанова бюро гарадскога камітэта партыі аб назначэнні паўторнага схода ячэйцы ЗРК «Профінтэрн», дзе першы справаздачны сход быў праведзены без удзела рабочых друкуемая сёння пастанова бюро ГК аб роспуску бюро ячэек КП(б)Б голкавай фабрыкі і белуціля павінна быць улічана кожнай ячэйкай, кожным парткалектывам. Мабілізаваць шырокія масы рабочых, пры цягнуўшы іх да самага актыўнага ўдзела ў справаздачных сходах—та кая задача.

Трэба правесці справаздачна-перавыбарчую кампанію па дзелавому, на высокім палітычным узроўні без парадкай шуміхі, па-большэвіцку дабіўшыся поўнага выканання прамфінплана, узняцця якасці прадукцыі, паляпшэння матэрыяльна-бытавых умоў рабочых, у прыватнасці поўнасцю забяспечыўшы іх дравамі, мабілізаваўшы масы на выкананне пастановы ЦК ВКП(б) аб рабоце харчовай прамысловасці, у пытаннях сельскай гаспадаркі няўхільна змагаючыся за тое, каб зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, усіх калгаснікаў заможнымі.

Так павінна праходзіць кампанія перавыбараў партыйных органаў і ва ўсёй гэтай рабоце чырвонай ніткай павінна праходзіць самая жорсткая і грунтоўная праверка ажыццяўлення пастановы ЦК КП(б)Б аб становішчы Віцебскай партыйнай арганізацыі і вынікаў правяркомаў па чыстцы, барацьба за поўнае выкананне ўказання ЦК аб неабходнасці «Сапраўды выкрыць і выгнаць з радоў партарганізацыі ўсё гніллё, перараджэнцаў і маскуючыхся класавых ворагаў», за далейшую бязлітасную барацьбу супроць сямейнасці, групаўшчыны, дробна-буржуазнай расхлябанасці, выбіраючы ў партыйныя органы „членаў партыі на справе паказаўшых сваю баяздольнасць і адданасць генеральнай лініі партыі, у барацьбе з апартунізмам усіх масцей".

ЦК ВКП(б)—тав. СТАЛІНУ.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б) Беларусі сумесна з рэспубліканскай камісіяй па чыстцы з удзелам начальнікаў палітаддзелаў шлюць табе тав. СТАЛІН, любімаму правадыру нашай партыі і ўсіх працоўных Совецкай краіны, вялікаму кіраўніку комуністычнага руха ва ўсім свеце—гарачае большэвіцкае прывітанне.

Наш пленум сабраўся напярэдадні XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б) для таго, каб падвесці вынікі чысткі партыйнай арганізацыі Беларусі і намеціць канкрэтную праграму дзеянняў для далейшага яшчэ больш шага разгортвання соцыялістычнага будаўніцтва ў Беларусі.

Ачысціўшы свае рады ад класава-чужых, апартуністычных, дзвурушніцкіх, буржуазна перараджэнцкіх нацыяналістычных элементаў, узняўшы сваю рэволюцыйную пільнасць—КП(б)Б, як неадлучная частка ўсёй вялікай ВКП(б), прыходзіць да XVII з'езда партыі большэвіцкі загартаванай, як ніколі згуртаванай вакол ленінскага ЦК, узначальваемага табой, тав Сталін.

Няўхільна выконваючы рашэнні ленінскага ЦК ВКП(б) і штодзённыя твае ўказанні большэвікі Беларусі пры брацкай дапамозе працоўных СССР дабіліся вялізарных поспехаў у будаўніцтве соцыялізма, у ажыццяўленні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Былая калонія рускага самаўладства ператварылася ў квітнеючую рэспубліку вялікай краіны Советаў. КП(б)Б і ў далейшым пад непаслабным кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і тваім, т. Сталін, будзе сакрушаць усякія спробы класавых ворагаў і іх агентуры ўнутры партыі парушыць брацкі саюз і адзінства працоўных народаў СССР. Пад сцягам пролетарскага інтэрнацыяналізма, пад сцягам барацьбы за ажыццяўленне нацыянальнай палітыкі Леніна—Сталіна ў непрымірымай барацьбе з ухіламі у бок вялікадзяржаўнага шавінізма, які прадстаўляе галоўную небяспеку ў маштабе ўсёй ВКП(б) і мясцовага беларускага нацыяналізма, з'яўляючагася галоўнай небяспекай на даным этапе ў Беларусі, КП(б)Б будзе і ў далейшым яшчэ больш загартоўваць свае рады, згуртоўваць і мабілізоўваць іх вакол ленінскага ЦК на чале з тав. Сталіным для далейшых перамог у будаўніцтве соцыялізма.

КП(б)Б расла і загартоўвалася ў барацьбе за генеральную лінію партыі, рашуча разбівала супраціўленне класавага ворага і яго агентуры, згуртоўвала і мабілізоўвала свае рады вакол ленінскага ЦК, любімага правадыра партыі і рабочага класа, неперасягнёнага ленінца, стратэга і тактыка большэвізма тав. Сталіна.

Дасягнутыя намі поспехі яшчэ больш абавязваюць нас да таго, каб рашуча і шпарка, па большэвіцку ліквідаваць тыя недахопы, якія маюцца ў нас у практычнай штодзённай рабоце і, у асаблівасці, на ўчастку нацыянальна культурнага будаўніцтва Беларусі.

Ад імя большэвікоў і ўсіх працоўных Совецкай Беларусі аб'яднаны пленум запэўняе ленінскі ЦК ВКП(б) і цябе тав. Сталін, што ў барацьбе за генеральную лінію партыі пад тваім кіраўніцтвам КП(б)Б будзе ўзорным атрадам нашай вялікай ленінскай партыі на заходнім рубяжы Совецкага саюза.

Няхай жыве наша вялікая партыя Леніна!

Няхай жыве ленінскі ЦК ВКП(б)—правадыр і настаўнік нашай партыі тав. Сталін!

АБ'ЯДНАНЫ ПЛЕНУМ ЦК І ЦКК КП(б)Б.

Вяртушка павінна работаць КРУГЛАСУТАЧНА, ні мінуты прастояў пад выгрузкай і нагрузкай.

ЗВОДКА гартопа па вывазцы дроў рабочым горада Віцебска за 28 снежня.

План вывазкі дроў у к/м.	Фактычна вывезена.	Патрэбна было забяспечыць пайнікаў.	Фактычна забяспечана.	Процант выканання плана.
838	550	333	220	66

Па віне Клемберга 27 снежня вяртушка прастаяла некалькі лішніх гадзін пад разгрузкай.

У свой час гартоп дамовіўся з разгрузачнай канторай ст. Віцебск аб тым, што прыбываючыя вагоны з дравамі разгружаюцца рабочымі канторы. Аднак, дамоўленасць гэта не выконваецца. Праверкай установлена, што 27 снежня вяртушка з дравамі прастаяла некалькі лішніх гадзін пад разгрузкай і гэтым самым была сарвана своечасовая падача вагонаў на станцыю для пагрузкі дроў. Віноўнікам гэтага з'яўляецца намеснік начальніка разгрузачнай канторы Клемберг, які не забяспечыў своечасовай разгрузкі вяртушкі.

Трэба дадаць, што грузчыкі надавычай дрэнна адносіліся да сваёй работы, самаўласна ламалі дошкі, якімі былі абсталяваны плацформы. Клемберг, ведаючы аб гэтым, не прыняў ніякіх мер да грузчыкаў. АБРАМЗОН.

ВЫКАНАННЕ ПЛАНА ЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ ЛЕСА І ДРОЎ ЛЕСПРАМГАСАМ У 4 КВАРТАЛЕ ПА СТАНОВІШЧУ НА 25 СНЕЖНЯ 1933 ГОДА.

(У процантах да плана).

Сельсовет	Вык. плана загатовак: Лес	Вык. плана загатовак: Дровы	Вывазка: Лес	Вывазка: Дровы
Замастоцкі	0,2	—	13,2	—
Шумілінскі	91,6	10,4	83,8	128,3
Сялюцкі	—	—	—	—
Рудніцкі	—	—	—	—
Машканскі	7,3	12,3	18,8	40,2
Рудакоўскі	0,03	2,5	8,5	0,7
Бабініцкі	8,0	4,5	3,5	52,7
Елагінскі	1,5	0 85	—	18 2
Бараўлянскі	106,0	16,5	90	—
Нікалаеўскі	37,6	22,6	33,3	3,7
Даўжанскі	47,7	29 3	32	35,2
Міхалёўскі	72	10,4	19,3	0,1
В.-лёгчанскі	5	61,4	—	105,5
Старасельскі	2,2	—	—	—
Разам па раёне	70,7	16,6	16,3	53,7

На ўчасткі выехалі брыгады „Віцебскага пролетарыя", пракуратуры і гаркома ЛКСМБ.

Учора рэдакцыя газеты „Віцебскі пролетарый", гарадская пракуратура і гарком ЛКСМБ накіравалі брыгады ў сельсоветы і на ўчасткі, дзе загатаўляюцца лес і дровы, для праверкі становішча соцбытавых умоў лесарубаў і возчыкаў, а таксама арганізацыю работ на ўчастках. Адначасова брыгады правяраюць работу АРС'а, калгасы і аднаасобныя пункты, як апошнія выконваюць заключаныя дагаворы на вывазку і загатоўку леса. Брыгады прабудуць на ўчастках не менш 5 дзён.

У задачы брыгад уваходзіць арганізацыя і выпуск насценных газет на ўчастках, мабілізацыя мас калгаснікаў і аднаасобнікаў на хутчэйшае выкананне плана загатовак і вывазкі дроў і леса, арганізацыя агульнараённага абоза з дравамі ў гонар гарадской партканферэнцыі. Сельсоветы і партыйныя ячэйкі абавязаны аказаць усямерную дапамогу брыгадзірам у выкананні стаячых перад імі задач.

С.

У СТАРЫМ СЯЛЕ ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ ПА-РАНЕЙШАМУ ЗЛАЧЫННА ЗРЫВАЮЦЦА, НА СІГНАЛЫ ДРУКУ НЕ РЭАГУЮЦЬ.

ВЫКАНАННЕ ПЛАНА ІЛЬНАЗАГАТОВАК ПА РАЁНУ НА 28 снежня.

(У цэнтнерах).

План.	Здана.	Проц. выкан.
1120	726,5	64,8

КУЛАЦКІ САБАТАЖ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗЛОМЛЕН.

Тэрміны здачы ільнавалакна канчаюцца, а між тым рад кіраўнікоў калгаса Старасельскага сельсовета не арганізаваў яшчэ па-баявому апрацоўку і здачу ільна, у выніку чаго маюцца яшчэ вя і ія запазычанасці. Так, калгас «ТРУДЖАНІК» (старшыня ГОЛІКАЎ) з плановых 1,5 тоны здаў толькі 500 кг., калгас «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ» (старшыня КАЧАНАЎ), замест 1 тоны па плану здаў толькі 209 кг., калгас «1 МАЯ» (старшыня САМАЖНЁЎ) план ільназдачы выканаў на 61,9 проц.

Яшчэ горш абстаіць справа па аднаасобнаму сектару.

У ЧЫМ-ЖА СПРАВА? Чаму сельсовет так ганебна адстае ў выкананні плана ільназагатовак. Асноўная прычына крыецца ў тым, што кіраўніцтва сельсовета гніла-ліберальніча з сабатажнікамі ільназагатовак. Члены сельсовета бяздзейнічаюць. Не арганізуецца ніякая дапамога працоўным аднаасобнікам у апрацоўцы ільна.

Газета „Віцебскі пролетарый" ужо сігналізавала аб гэтым сельсовеце. Аднак, кіраўніцтва сельсовета і партячэйка не зрабілі з гэтых сігналаў адпаведныя вывады, не мабілізаваліся самі і не мабілізавалі масы на барацьбу з кулацкім сабатажам, на разгортванне масава-растлумачальнай работы сярод працоўных аднаасобнікаў, арганізацыю ім дапамогі мяльнымі машынамі, памяшканнем для сушкі. Комуністы, комсомольцы не расстаўлены па пунктах. Работа працягваецца па-ранейшаму. Сакратар ячэйкі ГАРБУЛЬКА дагэтуль не пераключыўся на большэвіцкую барацьбу за лён, а гніла-ліберальнічае, патурае сабатажнікам.

Перадавыя калгасы, як «КОМУНАР», „2 ПЯЦІГОДКА" і „СВАБОДА" не мабілізаваны для дапамогі адстаючым калгасам у апрацоўцы ільна.

Трэба самым рашучым чынам зламаць кулацкае супраціўленне ільназагатовак.

Кожны аднаасобнік-кантрактант абавязан неадкладна канчаткова завяршыць план здачы ільна дзяржаве. Да злосных нездатчыкаў трэба прымаць меры ў адпаведнасці з апублікаванай учора пастановай ЦК КП(б)Б аб загатоўках ільна.

Кожны калгас, кожная аднаасобная гаспадарка павінны поўнасцю выканаць план ільназагатовак.

Старасельскі сельсовет павінен большэвіцкімі тэмпамі наверстаць упушчанае.

С. ЛАБАЧОЎ.

Аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі на голкавай фабрыцы і Белуціле.

ПАСТАНОВА БЮРО ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б АД 28 СНЕЖНЯ.

Бюро ГК КП(б)Б лічыць ход справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў ячэйках голкавай фабрыкі (сакратар тав. БРУК, і Белуціле (час. вык. абавяз. сакратара тав. ГРЭТУНЬ) выключна нездавальняючым і ні ў якім разе не забяспечваючым узняцця гэтай важнейшай палітычнай кампаніі на неабходны высокапрынцыповы ўзровень.

Самаправерачныя брыгады работаюць слаба, сярод рабочых не прапрацаваны важнейшыя палітычныя дакументы-пастановы пленумаў ЦК КП(б)У, ЦК КП(б)Б і ГК КП(б)Б па нацпытанні, пастанову ЦВК і СНК БССР аб адказнасці за якасць прадукцыі; дырэктыву ЦК ВКП(б) аб харчовай прамысловасці, на голкавай фабрыцы сход з-за непадрыхтаванасці сарваўся. Да самаправеркі не прыцягнуты члены правяркомоў, самаабавязацельствы, узятыя фабрыкамі ў парадку падрыхтоўкі да XV і XVII з'ездаў партыі, не выконваюцца і не правяраюцца з боку бюро ячэйкі. Усё гэта сведчыць ад адсутнасці большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі ў партарганізацыі гэтых прадпрыемстваў.

Бюро ГК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. За праяўленне палітычнай блізарукасці, апартуністычную недаацэнку важнейшых рашэнняў партыі і ўрада, якія павінны быць пакладзены ў аснову ўсёй справаздачна-перавыбарчай кампаніі, безадказныя адносіны да выканання рашэння пленума ГК КП(б)Б ад 18 снежня па пытанні справаздачна-перавыбарчай кампаніі і фактычны правал гэтай работы на прадпрыемствах. БЮРО ЯЧЭЕК ГОЛКАВАЙ ФАБРЫКІ І БЕЛУЦІЛЯ распусціць і аб'явіць вымову усяму складу бюро гэтых ячэек. Сакратара ячэйкі голкавай фабрыкі тав. БРУКА і часов. выконв. абавязкі сакратара ячэйкі Белуціля тав. ГРЭТУНЬ з работы сакратароў ячэек ЗНЯЦЬ.

2. Прызначаны на 28 снежня 33 г. перавыбарчы сход на голкавай фабрыцы адмяніць. Аргаддзелу прымацаваць да ячэек голкавай і Белуціля таварышоў з кіруючага актыва для дапамогі ў рабоце па правядзенні справаздачна-перавыбарчай кампаніі адклікаўшы ад прадпрыемстваў раней прымацаваных і фактычна не ўдзельнічаючых у рабоце т.т. РОХКІНА і АБЕЛЕВА, пытанне аб іх абмеркаваць дадаткова на пасяджэнні бюро ГК КП(б)Б у іх прысутнасці.

3. Даручыць усім парткалектывам і ячэйкам прапрацаваць гэта рашэнне, зрабіўшы з яго адпаведныя вывады ў сваёй рабоце і ў правядзенні справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

НАМ. САКРАТАРА ГК КП(б)Б В. БАШМАЧНІКАЎ.

АБ НЕЗАХАВАННІ ЎСТАНОЎЛЕНАГА МОДУСА ВЫБАРАЎ ДЭЛЕГАТАЎ НА III ГАРПАРТКАНФЕРЭНЦЫЮ Ў ЯЧЭЙЦЫ ПЕДІНСТЫТУТА.

Пастанова ГК КП(б)Б ад 27 снежня 1933 года.

Канстатаваць, што пры выбарах дэлегатаў на III гарпартканферэнцыю ў ячэйцы педінстытута парушан устаноўлены пленумам ГК КП(б)Б модус прадстаўніцтва (1 дэлегат з рашаючым голасам ад кожных 15 членаў партыі і 1 дэлегат з дарадчым ад кожных 30 кандыдатаў), сходам выбрана 2 дэлегата з рашаючым і 1 з дарадчым голасам пры наліччы ў ячэйцы 20 членаў і 7 кандыдатаў КП(б)Б.

У адпаведнасці з гэтым ВЫБАРЫ ДЭЛЕГАТАЎ у ячэйцы педінстытута АДМЯНІЦЬ, прапанаваўшы бюро ячэйкі склікаць паўторны сход для выбараў дэлегатаў на гарпартканферэнцыю, выходзячы з устаноўленага модуса—1 дэлегата.

Прапанаваць усім парткалектывам і ячэйкам пры выбарах дэлегатаў на канферэнцыю няўхільна прытрымлівацца ўстаноўленага модуса.

Нам. сакратара ГК КП(б)Б БАШМАЧНІКАЎ.

26 снежня. ДЗЁННІК ХОДА ПЕРАВЫБАРАЎ ПАРТОРГАНАЎ.

❋ РАБОТНІЦЫ МОТАЛЬНАГА ЦЭХА ФАБРЫКІ «ДЗВІНА» выконваюць на справе ўзятыя на сябе ў звязку з перавыбарамі парторганаў абавязацельствы: т. НЕСТЕРАВА раней рабіла 8 зёмаў, зараз—9; БАРЫКА да гэтага рабіла 6—7 зёмаў, зараз—8—9 зёмаў; ТІГРОВА замест 9 робіць—10. Старая работніца г. ФІЛІПАВА замест 7—робіць—9—10 зёмаў.

❋ ЛЕПШЫЯ ЛЕНТЫ НА ФАБРЫЦЫ «ПРОФІНТЭРН» 10, 1, 6, 7, 9 і 14 сістэматычна выконваюць план на 102—104—106—109 проц. і такім чынам на справе выконваюць узятыя самаабавязацельствы.

ДЭЛЕГАЦЫЯ КАЛГАСНІКАЎ ДНЕПРАПЯТРОЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ НА ПРЫЁМЕ У тт. СТАЛІНА І КАГАНОВІЧА.

23 снежня дэлегацыя калгаснікаў Днепрапятроўскай вобласці (Украіна) наведала тт. Сталіна і Кагановіча. Дэлегацыя складалася з 50 ударнікаў ад калгасаў заваяваўшых першынства ў соцыялістычным спаборніцтве, якое ахапіла у гэтым годзе усю вобласць.

У двухгадзіннай ажыўлёнай гутарцы таварышы калгаснікі расказалі тт. Сталіну і Кагановічу аб тых дасягненнях, якіх дабіліся ў гэтым годзе калгасы Днепрапятроўшчыны.

Сярод дэлегатаў ёсць прадстаўнікі такіх калгасаў, якія атрымалі на працадзень па 12, 15 і 20 кілограм збожжа і па 2—3—7 рублёў грашыма на працадзень, г. зн. ад 400 пудоў да 800 і 1000 пудоў збожжа на сям'ю, (не лічачы іншых прадуктаў) і ад 1000 рублёў да двух і трох тысяч рублёў.

— Ці ёсць у вашай вобласці—пытаўся т. Сталін—такія калгасы, якія атрымалі на працадзень менш 3 кілограм збожжа.

— Не,—адказалі дэлегаты, — такіх калгасаў у гэтым годзе у нашай вобласці няма.

Прадстаўнік аднаго калгаса маючага (Ураховыя палі расказаў, што у іх у сярэднім калгаснік атрымаў па 50 цнт. збожжа і 20 кг. цукру, а асобныя калгаснікі атрымалі па 8 пудоў цукру.

Дэлегаты аднадушна адзначалі не толькі велізарны рост прыбыткаў калгаснікаў, але і значны рост агульнай маёмасці калгасаў, у прыватнасці рост жывёлагадоўчых ферм у калгасах.

Тав. ПАПОВІЧ, калгаснік арцелі «КРАСНЫЙ БОГАТЫРЬ» сказаў, што у калгасе ёсць 450 авечак, дойная малочна-таварная ферма, 204 коней.

Тав. МАЛЬШТЭЙН (яўрэйскі калгас «ФРАЙГАЙТ» расказвае, — калі калгас арганізаваўся ў 1929 годзе ў яго нічога не было. Зараз у калгасе ферма на 200 кароў, у кожнага калгасніка ёсць карова і дробная жывёла На працадзень калгаснікі атрымалі па 7,5 кіло збожжа і па 7 руб. грашыма.

У іншым калгасе, які складаецца з 47 двароў ёсць ферма ў 240 кароў, акрамя таго ў кожнага калгасніка карова. У сярэднім кожны калгаснік атрымаў на працадні па 50 цнтн. збожжа. Менш 25 цнтн. не атрымаў ніводзін.

Ёсць між іншым, і такія калгасы, у якіх яшчэ мала жывёлы, яшчэ не ў кожнага калгасніка ёсць карова.

Усе дэлегаты адзначалі рост новага будаўніцтва ў калгасах: скотных двароў, жыллёвых дамоў, электрастанцый, клубаў, школ семігодак і г. д. Рост калгаснай гаспадаркі выклікае патрабу ў новых машынах, аўтамабілях.

Т. ХІЖНЯК, прадстаўнік калгаса «III ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» расказвае, што яны не толькі наладзілі электрамаладзьбу і абвадненне палёў, але ацяпляюць электрычнасцю і свінарнік на 350 свіней.

— Ну і што-ж, запытвае смяючыся тав. Сталін,—свінні адчуваюць гэта?

— Ого, яшчэ як адчуваюць!—такса ма смяючыся адказвае дэлегат.

Трансфарматар у нас добры, нам-бы яшчэ толькі адзін матор і праўдаў, так мы усе палі асветлім і абслужым электрычнасцю,—заключае тав. ХІЖНЯК.

Многія з дэлегатаў падкрэслівалі культурны рост вёскі і яшчэ большы рост культурных патрабаванняў.—Збожжа ў нас многа, гаспадарка мацнее, зараз усе цягнуцца да культурнага жыцця,—гаварылі дэлегаты.

А многія прама з гэтага пачыналі:

— Калі мяне абіралі ў дэлегацыю, то прама прасілі сказаць вам т. Сталін, што пабольш патрэбна культуры для вёскі, кіно, тэатраў, школ, кніг добрых, радыё, аграномаў, ну, і зразумела пабольш тавараў.

Тав. Сталін цікавіўся работай калгасных брыгадзіраў, ці ўдалося падабраць добрых дзельных работнікаў брыгадзірамі, ці не змяняюць іх дарэмна.

Асабліва тт. Сталін і Кагановіч цікавіліся становішчам і работай жанчыны ў калгасах, ці не зацiраюць жанчын, ці многа жанчын—брыгадзіраў, старшынь калгасаў. Яны з папрокам адзначылі, што сярод дэлегатаў мала жанчын: на 50 чалавек усяго некалькі калгасніц.

Дэлегаты згадзіліся, што гэта ўпушчэнне і расказалі, што жанчыны займаюць зараз выдатную ролю ў калгасах. Няма такой работы, якую-б яны не выконвалі.

Гэта падцвердзіла і дэлегатка ОРЫНА ДОВГАЛЬ.

— Ну, а як зараз, лепш стала з жанчынай, не б'юць больш жонак сяляне?—Спытаў яе тав. Сталін.

Тав. ДОВГАЛЬ нават не зразумела адразу пытання, а зразумеўшы—рассмяялася:—Ды не, цяпер не чапаюць, хіба-ж у калгасе гэта можна. То раней было, а цяпер няма.

Начальнік палітаддзела прасянскай МТС тав. Волкаў расказаў, як работаюць МТС і палітаддзелы. Ён адзначыў, што нашы сельска-гаспадарчыя ўстановы не заўсёды чотка работаюць, указаў на перабоі з дастаўкай запасных частак да рамонта трактароў, якія бываюць па віне тых, хто плануе накідку частак. Наркамзем СССР прапанаваў МТС завесці ўласную гаспадарку на 350 га. Гэта ператварае МТС ў маленькі совгас і адцягвае яе ад непасрэднай работы.

— Гэта не правільна зрабіў Наркамзем,—сказаў тав. Сталін.

Тт. Сталін і Кагановіч падрабязна распытваліся ў т. Волкава аб справах МТС, у прыватнасці аб тым, як і які праводзіцца ў Днепрапятроўскай вобласці севазварот.

Пад канец, у адказ на просьбу дэлегацыі—выказацца, тав. Сталін гаворыць не вялікую прамову. Тав. Сталін гаворыць аб дасягненнях калгасаў і ўказвае, што гэта толькі першыя крокі. Нават 10—12 кілограмаў на працадзень яшчэ мала. Патрэбна больш. І будзе ў калгаснікаў многа больш, калі яны сумленна будуць работаць у калгасе. Тое, што дасягнута, — гэта толькі пачатак, першы крок. Патрэбна дабіцца большага, каб можна было жыць усім заможна. У калгасах ёсць зараз усё, што патрэбна для заможнага жыцця. У калгасах ёсць выдатная зямля і пры тым у такой вялікай колькасці, аб якой не маглі марыць кулакі. Зараз-жа не старыя часы, калі патрэбна было купляць кожны кавалачак зямлі і капіць на гэту справу грошы гадамі. Зямля зараз грамадская, народная, замацаваная за калгасамі назаўсёды. Вы толькі работайце і апладнайце зямлю працай,—у зямлі недахопа не будзе. У калгасах ёсць, далей, ТРАКТАРЫ, СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫЯ МАШЫНЫ і пры тым у такой вялікай колькасці, аб якой не смелі нават марыць кулакі, памешчыкі. А трактароў і машын будзе ў вас усё больш і больш. Нарэшце ў калгасах ёсць свой РАБОЧА-СЯЛЯНСКІ ЎРАД, які дапамагае сялянам усімі мерамі, усімі сродкамі. У свеце няма іншай краіны, дзе-б сяляне мелі свой, совецкі ўрад, дапамагаючы ім і падтрымліваючы іх. Толькі ў нашай краіне маецца такі ўрад, які надзяляе працоўных сялян аб'яднаных у калгасы, лепшымі землямі, прадстаўляе ім трактары і машыны і абараняе іх ад прыгнятацеляў эксплаататараў. Значыць у калгасах ёсць усё для таго, каб жыць заможна. Патрэбна ім яшчэ толькі адно: работаць сумленна і берагчы калгаснае дабро. І калі ўсе калгаснікі,—усе, а не толькі большасць,—будуць работаць сумленна,—калгасы завалянца прадуктамі, яны завалянца ўсякім дабром і наша краіна стане самай багатай краінай у свеце. Аб тым, каб тавараў для вёскі было больш—аб гэтым паклапоціцца ўрад і партыя. У гэтым можаце не сумнявацца.

Пасля сканчэння гутаркі тт. Сталін і Кагановіч цёпла развіталіся з дэлегацыяй.

ЗАМАСТОЧЧА, РУДАКІ, МАШКАНЫ І БАРАЎЛЯНЫ ЗРЫВАЮЦЬ ЗАВЯРШЭННЕ ССЫПКІ НАСЕННЯ.

УСЮ ЎВАГУ, УСЕ СІЛЫ НА ПОЎНАЕ ВЫКАНАННЕ ПЛАНАЎ ЗАСЫПКІ НАСЕНФОНДАЎ!

НЕАДКЛАДНА ЗАВЯРШЫЦЬ ПОЎНУЮ ССЫПКУ НАСЕННЯ.

Друкуемая сёння зводка аб ходзе ссыпкі насенных фондаў на 20 снежня гаворыць аб тым, што няма рэзкага пералому ў бок поўнага завяршэння засыпкі насення збожжавых (прырост за дэкаду па раёну 12,1 проц.), а па бульбе мы маем нават некаторае зніжэнне (на 0,9 проц.)

У параўнанні са становішчам ссыпкі на 10 снежня некальві пасунуліся наперад Рудніцкі, Рудакоўскі, Старасельскі сельсоветы. Як і раней на апошнім месцы па засыпцы насенных фондаў знаходзяцца Замастоцкі і Машканскі сельсоветы, якія сваім адставаннем зрываюць завяршэнне ссыпкі па ўсяму раёну.

Асабліва небяспечнае становішча гэта са ссыпкай насення ільну (54,3 проц. па раёну), Машканскі сельсовет не ссыпаў яшчэ і адной дзесятай часткі патрэбнай колькасці ільна насення.

Неабходны такія тэмпы ссыпкі насення, каб у бліжэйшыя 2—3 дні наш раён мог рапартаваць аб поўнай засыпцы высокаякасных насенных фондаў—выкананні другой запаведзі і гэтым самым даў магчымасць усёй БССР атрымаць права на бесперашкодны гандаль хлебам і бульбай.

Зводка гарза аб ходзе ссыпкі насенных фондаў на 20 снежня 1933 года.

(У процантах да плана).

Сельсовет	Старшыня	Ссыпана насення: Збожжавых	Бульбы	Ільна-насення
КАЛГАСЫ ЗОНЫ ДЗЕЙНАСЦІ МТС:				
Бабініцкі	Янушэвіч	116,3	136,6	80,7
Сялюцкі	Ершоў	98,9	122,0	69,9
Елагінскі	Пруднікаў	98 3	125,3	65,6
Віцебскі	Крышчонак	90	122,4	47,5
Вяліка-лётчанскі	Когаль	86,3	122,0	37,1
Бараўлянскі	Куракоў	81,1	149,3	47,5
		98,3	131,0	63
КАЛГАСЫ, НЕ АБСЛУГОЎВАЕМЫЯ МТС:				
Міхалёўскі	Шапкоўскі	111,4	92,7	87,7
Старасельскі	Бялы	103,3	76,6	53,4
Нікалаеўскі	Мінакоў	90,6	95,1	90
Рудніцкі	Іваноў	85,2	77,3	25,6
Даўжанскі	Піскуноў	84,6	64,9	40
Шумнянскі	Арлоўскі	83,8	85,3	46,4
Рудакоўскі	Гусакоў	76,2	78,7	44,6
Замастоцкі	Колатаў	61,1	77,3	66,3
Машканскі	Астапаў	54,7	85,5	6,7
		80,7	81,5	50
		87,3	98,5	54,3

Граюць на руку кулацтву.

У кіраўніцтве калгаса „Вялікая чэрніца“. Замастоцкага сельсовета, настрой поўныя самазаспакоенасці. Нікога не турбуе, чым калгас будзе сеяць вясной.

350 пудоў ячменя па недагляду кладаўшчыка Пляшкова пачалі гарэць, а праўленне доўгі час да гэтага не прымала ніякіх мер. І зараз гэты ячмень не правераны на ўсхожасць, невядома ці годны ён на насенне.

Во амаль увесь стаяў на полі аж да 19 снежня. Будучы з восені мокрым, ён зараз змёрз і бясспрэчна на насенне не годны.

У брыгадзе № 4 Салаўёва яшчэ стаіць на полі каля 5 га вікі

Насенне не сартуецца. Справа гэтая была даручана кладаўшчыку Пляшкову, але ён больш часу праводзіць у калгасе імя Яраслаўскага ў сваякоў.

У час сартоўкі ячменя ПЛЯШКОЎ перадаў ключы ад кладоўкі калгаснікам, а сам кудысці ўходзіў. У выніку такога „кіраўніцтва“ брыгада адсартавала за дзень толькі каля 20—30 пуд.

Нават мелі месца такія выпадкі, калі з-за адсутнасці Пляшкова, у брыгадзе № 3 у засекі ссыпалі неўважаны ячмень. У кладовую гэтай брыгады заходзяць усе каму не лень, бо замок адмыкаецца цвікам.

Сельсовету, гарза вінаватых трэба жорстка пакараць і прыняць меры, якія-б забяспечылі поўную засыпку і захаванасць насеннага фонду ў гэтым калгасе, інакш ён застанецца на вясну без насення.

КАНАПЕЛЬКО.

Замест засыпкі насення займаюцца „очковтирательством“.

На 22 снежня ў калгасе імя ЛЕНІНА, Замастоцкага сельсовета, яшчэ не адсартавана нізоднага кілограма збожжа для засыпкі насенных і страхавых фондаў.

Ячмень і авёс абмалочан, але затрымліваецца малацьба вікі, якой яшчэ не абмалочана 54,25 га. Самы вялікі прарыў у малацьбе вікі па брыгадзе № 3, дзе яшчэ не абмалочана 21,5 га. У брыгадзе многа прагулаў, позніх выхадаў на работу калгаснікаў, на што праўленне калгаса не рэагуе.

Але гэтае адчаднае становішча з засыпкай насення зусім не перашкаджае праўленню калгаса даваць звесткі ў сельсовет, што напрыклад на 10 снежня, аўса патрэбна засыпаць 117 цэнтн., а засыпана 88, ячменя патрэбна 88, засыпана 28, яравой пшаніцы 11 цэнт, засыпана—2. Гэтыя звесткі зуня „очковтирательские“. Сельсовет не правярае сапраўднага становішча засыпкі насенных фондаў і пасылае такія зводкі ў гарза.

Неадкладная задача сельсовета рашуча ўзяцца за арганізацыю засыпкі насенных і страхавых фондаў, штодзённа правяраць як ідзе засыпка, якасць засыпаемага насення, захаванасць яго.

ГРЫНМАН.

ПЯТЫ ДЗЕНЬ завочнай нарады сакратароў парткалектываў і ячэек.

Правесці падрыхтоўку і перавыбары парторганаў на высокім палітычным узроўні.

У парадку дня—абмен вопытам па ажыццяўленню вывадаў правяркомаў і перабудове партмасавай работы.

(Старшыня завочнай нарады—загадчык аргаддзела Віцебскага гаркома КП(б)Б тав. БАШМАЧНІКАЎ).

Старшыня: наступнае слова ў спрэчках павінна было быць прадастаўлена сакратару партыйнага калектыва фабрыкі „Дзвіна“ т. КВІНТА, але ў сувязі з тым, што апошні адсутнічае, слова прадастаўляецца сакратару партыйнай ячэйкі загатзбожжа тав Зарэцкаму. Раней чым т. Зарэцкі пачне выказвацца неабходна зрабіць наступныя заўвагі. У партыйных калектывах і ячэйках разгарнулася работа па распрацоўцы матэрыялаў снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б, ЦК КП(б)У і аб'яднанага пленума Віцебскага гаркома і гарКК КП(б)Б па пытанні ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі і перавыбараў парторганаў.

Вось я і звяртаю сур'ёзную ўвагу на гэтыя моманты ўсіх удзельнікаў нашай завочнай нарады. Выказваючымся ў спрэчках неабходна дэталёва перадаць як у ячэйках, парткалектывах ідзе праработка гэтых важнейшых дакументаў, як рыхтуюцца партыйныя ячэйкі да перавыбараў, як практычна рэалізуюцца вывады правяркомаў і як ячэйкі разгортваюць масавую работу па падрыхтоўцы да надыходзячых з'ездаў партыі.

У нас у спрэчках выказаліся рад таварышоў, якія падзяліліся вопытам перабудовы работ партячэек, рэалізацыі вывадаў правяркомаў у вытворчых ячэйках.

А зараз слова мае тав. ЗАРЭЦКІ па пытанню першых крокаў адной з савецкіх партячэек—ячэйкі загатзбожжа —у справе перабудовы партработы.

Зарэцкі: наша партыйная ячэйка налічвае 16 чалавек членаў партыі. Акрамя апарата ЗАГАТЗБОЖЖА ячэйка абслугоўвае апарат ПЛОДАГАРОДНІНЫ, МЕЛЬКІРАЎНІЦТВА І ХЛЕБНУЮ ДЗЯРЖАЎНУЮ ІНСПЕКЦЫЮ. На ўсіх гэтых адзінках маюцца парторганізатары, якія адказваюць за палітмасавую работу. Кожны парторганізатар, кожны член і кандыдат партыі нашай ячэйкі актыўна змагаецца за ажыццяўленне вывадаў праверачнай камісіі па чыстцы нашай ячэйкі. Парторганізатары атрымліваюць заданні ад бюро партыйнай ячэйкі, а таксама ад мяне асабіста, як сакратара, выконваюць гэтыя заданні, а потым на бюро партыйнай ячэйкі дакладваюць аб выніках правядзення атрыманых даручэнняў. Вось напрыклад член партыі т. РУДАКОЎ. Ён работае у Чапіцкім гарадку. З'яўляецца парторганізатарам. І трэба сказаць, што як парторганізатар сябе апраўдвае. Рудакоў у прыватнасці, арганізаваў выпіску газет сярод рабочых, праводзіць громкія чыткі сярод рабочых і здатчыкаў сена і збожжа ў час абедзенных перапынкаў, азнаямляючы апошніх з асноўнымі пастановамі партыі і ўрада і сваёй добрай работай падае асабісты прыклад у ажыццяўленні дырэктыў партыі і ўрада.

Ажыццяўляючы прапановы камісіі па чыстцы мы ачысцілі свой апарат ад чужых і класава-варожых элементаў, як МЯДЗВЕЦКАГА былы царкоўны староста, САВЕЛЬЕВА—(былы афіцэр, сын кулака); ЖДАНАВАЙ (дачкі папа).

Усе гэтыя былыя людзі залезшы ў наш апарат праводзілі шкодныя, варожыя справы. Партыйная ячэйка наўхільна ажыццяўляючы наказ правяркома рашуча ачысціла апарат ад гэтых ворагаў, узняла рэвалюцыйную пільнасць кожнага члена і кандыдата партыі, мабілізаваўшы іх на выкрыццё і бязлітасную барацьбу супроць класава-варожых элементаў, якія прабіраюцца „цішком“ і вядуць сваю падрыўную работу „ціхай сапай“.

Разам з меўшыміся і яшчэ і зараз не знішчанымі буйнымі недахопамі ў рабоце апарата загатзбожжа мы дабіліся першых зрухаў уперад. Трыкутнік прыцягнуўшы да судовай адказнасці тых, хто шкодзіў у нашым апараце, мабілізаваў работнікаў апарата на ўдарную работу і дабіўся таго, што нарыхтованае сена і збожжа зараз знаходзяцца ў нармальным становішчы. Аб гэтым прызнала інспекцыя, якая на днях праводзіла абследаванне і склала акты аб хаванні сена і збожжа. Мы ліквідавалі абязлічку, якая панавала на віцебскай тэхбазе. Зараз праведзена сталая інвентарызацыя і расстаўлены адпаведным чынам работнікі, якія адказваюць за склады, за маёмасць загатзбожжа.

Заданне па сушцы збожжа, прасоўцы сена і здачы яго па нарадах намі выканана. Перад загатоўчай кампаніяй і ў час правядзення гэтай кампаніі партыйнай ячэйкай былі разасланы члены партыі на вёску для правядзення масава-растлумачальнай работы аб неабходнасці выканання паставаў добраякасным збожжам, сенам і інш

На загатоўчых пунктах намі таксама была разгорнута масава-выхаваўчая работа. Кожны пункт быў забяспечан адпаведнай літаратурай, бібліятэчкамі і прапагандыстамі, якія праводзілі палітмасавую работу ў час прыёмкі.

У парадку выканання вывадаў правяркома па чыстцы нашай ячэйкі мы арганізавалі камсамольскую ячэйку. Зараз наша камсамольская ячэйка налічвае 8 чалавек. Камсамольская ячэйка пастаянна дапамагае партыйнай ячэйцы ва ўсёй партыйна-масавай рабоце, якая шырока разгарнулася ў звязку з падрыхтоўкай да XVII з'езда ВКП(б), XV з'езда КП(б)Б і перавыбараў парторганаў.

Мы арганізавалі наступныя тэхнічныя гурткі па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы работнікаў нашай сістэмы: па вывучэнні БУХГАЛТЭРЫІ, ПРЫЁМШЧЫКАЎ І ЗАГАДЧЫКАЎ СКЛАДАЎ, ГРУЗЧЫКАЎ, ВОЗЧЫКАЎ. Такія-ж гурткі арганізаваны па сістэме мелькіраўніцтва і плодагародніны. Работа ў гэтых гуртках па лепшым ўладанні тэхнікай сваёй спецыяльнасці праводзіцца на аснове спаборніцтва і ўдарніцтва.

Зараз разгарнулася спаборніцтва паміж бухгалтэрыяй Загатзбожжа Віцебска з бухгалтэрыяй Гомельскай МРК на тэрміновае складанне і прадстаўленне Белканторы якаснага баланса.

Хайкін: Тав. Зарэцкі, ты адзначыў, што ў ячэйцы разгарнулася падрыхтоўка да сустрэчы з'езду партыі, а вось як-бы канкрэтней, што робіцца і хто робіць?

Зарэцкі: арганізаваны ударныя брыгады імя XVII з'езда партыі. Так брыгада возчыкаў, брыгадзір т. БАЧАРАЎ, у склад якой уваходзяць лепшыя ўдарнікі тт. ПЕСКІН, КІСЕЛЬГОФ і ДЗЯНІСАЎ замест 5 абаротаў па дастаўцы збожжа робяць 7 абаротаў у дзень, добра захоўваюць каня, уважліва сочаць за захаваннем збожжа, за цэльнасцю і сахраннасцю збруі і інш.

Або вось брыгада т. РАВІЧА, у складзе тт МАЦКЕВІЧ І., МАЦКЕВІЧ В. і КЛІМЕНКОЎ. Яны даюць найлепшую сушку збожжа, ударна работаюць па ўкладцы мяшкоў, акуратна захоўваюць ад псавання мяшкі і найлепш аберагаюць збожжа.

Загадчык складам тав. ЛІБЕРМАН добрасумленна адносіцца да работы, акуратна праводзячы вартавую і супроцьпажарную ахову, вядзе барацьбу са стратчыкамі збожжапрадуктаў. Яго склад знаходзіцца ў здавальняючым становішчы.

Вынікам першых крокаў у справе перабудовы партыйна-масавай работы ў нашай ячэйцы і работы па рэалізацыі прапаноў правяркома з'яўляецца і тое, што зараз мы ведаем людзей, работнікаў свайго апарата, ведаем лепшых ударнікаў, ведаем ілжэўдарнікаў, зрыўшчыкаў работы, парушыцеляў працоўнай дысцыпліны, з якім вядзем самую бязлітасную барацьбу.

Папкова: А ты, тав. Зарэцкі, не саромся і назаві па прозвішчы парушыцеляў працоўнай дысцыпліны?

Зарэцкі: Сароміцца мне нечага, «сор з хаты» я не баюся вынесці. Сістэматычна на работу спазняюцца РАГОЎСКІ і МЕЛЬЧЫН. Мы аб іх неаднаразова гаварылі на нашых агульных сходах, імкнуліся іх падцягнуць мерамі грамадскага ўздзейнічання, але зараз патрэбна будзе самым рашучым чынам зрыўшчыкаў, прагульшчыкаў, парушыцеляў нашай працоўнай дысцыпліны прыцягваць да адказнасці.

Зараз аб надзвычайна важным участку нашай работы—аб партыйнай вучобе. Правяркам па чыстцы нашай ячэйкі ў сваіх вывадах паказаў, што палітвыхаваўчая работа ў ячэйцы адсутнічала і таму значная частка членаў ячэйкі палітычна слаба падрыхтавана. Выконваючы прапановы правяркома мы арганізавалі кандыдацкі гурток, у якім займаецца 4 партыйцы і беспартыйныя работнікі апарата загатзбожжа. Сам я, як сакратар ячэйкі, наведваю дэкадны камвуз. 7 чалавек членаў нашай ячэйкі займаюцца ў сістэме завочнага партыйнага навучання і 4 чал. да гэтага часу зусім партыйнай вучобай не былі ахоплены (у гэтым—наша значная віна). На апошнім пасяджэнні бюро ячэйкі вынесена пастанова арганізаваць школу, якой ахапіць тых, што не навучаюцца. Зараз гэта пастанова ажыццяўляецца, школа арганізавана, кіраўнікам яе прызначан тав. ХАЙКІН.

Ячэйка разгарнула распрацоўку пастаноў снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б, ЦК КП(б)У і аб'яднанага пленума Віцебскага гаркома і гарКК-КП(б)Б па пытанні ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі і правядзенні справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганаў.

17 снежня па гэтым пытанні намі праведзен партыйны сход. Зараз дэталёвая распрацоўка матэрыялаў пленума перанесена і праводзіцца на сходах работнікаў нашай сістэмы, а таксама ў гуртках і школах сеткі партыйнай асветы.

Усю сваю партыйна-масавую работу мы зараз разгортваем пад лозунгам падрыхтоўкі і сустрэчы з'ездаў партыі і раённай партыйнай канферэнцыі Віцебшчыны КАНКРЭТНЫМІ справамі рашучага паляпшэння работы кожнага звяна апарата загатзбожжа.

Агляд друку

АБ „ШАПКАХ“, ПАД ЯКІМІ ПУСТОЕ МЕСЦА.

Шматтыражкі „СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ“—рэдактар тар. УГОРЭЦ, „ПАНЧОШНІЦА“—рэдактар тав. ЗАЙЦАЎ.

Рашэнні снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б па нацыянальнаму пытанню ўскладаюць на фабрычна-заводскі друк асабліва адказныя задачы па мабілізацыі партыйцаў, комсомольцаў і беспартыйных рабочых на наўхільнае ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі, як састаўной часткі барацьбы за генеральную лінію партыі.

Абавязак кожнай фабрычна-заводскай газеты заключаецца ў тым, каб на сваіх старонках шырока папулярызаваць рашэнні снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б і змагацца за іх наўхільнае ажыццяўленне, пранізваючы ўвесь свой змест барацьбой за пралетарскі інтэрнацыяналізм, бязлітасна выкрываючы на сваіх старонках па прозвішчах канкрэтных носьбітаў буржуазна-кулацкага нацыяналізма—нацыянал-апартуністаў.

ФАБРЫКА „СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ“ мае у сваім складзе рабочых розных нацыянальнасцей. Гэта абавязвае газету «Сцяг індустрыялізацыі» (рэдактар УГОРЭЦ) асабліва сур'ёзную ўвагу звярнуць на пастаноўку на сваіх старонках пытанняў інтэрнацыянальнага пралетарскага выхавання.

Што-ж мы маем на справе?

З прагледжаных нумароў шматтыражкі фабрыкі, пачынаючы з 7 лістапада да 22 снежня, НІ Ў АДНЫМ НУМАРЫ ГАЗЕТА абсалютна не ўдзяліла ўвагі пытанню інтэрнацыянальнага выхавання рабочых фабрыкі.

Маўчыць газета па пытаннях барацьбы за ленінскую нацыянальную палітыку, за пралетарскі інтэрнацыяналізм, калі не лічыць змешчанага ў апошнім нумары артыкула аб зрыўшчыках мопраўскай работы. Але артыкул гэты напісан бяззуба, вострыя вуглы згладжаны. З гэтага артыкула відаць, што мопраўская работа на фабрыцы пастаўлена з рук вон дрэнна, але газета чамусьці абыходзіць тое, што за зрыў мопраўскай работы нясуць адказнасць бюро цэхавых ячэек, якія не забяспечылі штодзённага кантроля і праверкі работы абраных у кіруючы склад мопраўскай арганізацыі фабрыкі.

У двух нумарох газеты, якія вышлі ПАСЛЯ апублікавання рашэнняў снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б па нацпытанні і перавыбарах партыйных органаў, газета амаль ні слова не гаворыць аб гэтых важнейшых рашэннях, не мабілізуе партыйцаў, комсомольцаў і ўсю рабочую масу, не дапамагае выкрываць канкрэтных носьбітаў буржуазна-кулацкага нацыяналізма, якія карыстаючыся згубай рэвалюцыйнай пільнасці, прабраліся у асобныя звенні фабрыкі і як гэта выяўлена зараз вялі шкодніцкую, падрыўную работу. Газета „Сцяг індустрыялізацыі“ аб усім гэтым маўчыць і да сёняшняга дня, чым дапускае грубую палітычную памылку.

* *

У адным з нумароў шматтыражкі «Панчошніцы» (№ 36) была змешчана «шапка»:

„Накіроўваючы галоўны агонь па мясцоваму беларускаму нацыяналізму, як галоўнай небяспецы ва ўмовах БССР, ні на мінуту не паслабляць барацьбы з вялікарускім шавінізмам і шавінізмамі іншых колераў“.

Змест гэтай «шапкі» здавалася-б абавязваў газету «Панчошніца» змясціць адпаведны зместу матэрыял. Але газета гэтага не зрабіла. Змясціўшы артыкул пад назвай „вострэй рэволюцыйную пільнасць“ газета надзвычайна востра і бязлітасна кажа аб вылазках буржуазных нацыяналістаў.. у ветзоаінстытуце і палітэхнікуме, але разам з тым ні слова, ні радка не піша аб тых вылазках агентаў буржуазных нацыяналістаў (Вільціна і інш) якія пралезшы ў асяродзе рабочых фабрыкі спрабавалі весці там антысавецкую агітацыю, але ад саміх рабочых фабрыкі атрымалі сакрушальны і досыць моцны адпор. Аб усім гэтым газета маўчыць, газета абмяжоўваецца ў адным з артыкулаў кажучы, што:

„На нашай фабрыцы з гэтым пытаннем (са справай інтэрнацыянальнага выхавання. Рэд) абстаіць таксама не добра“

Газета не выкрыла ні аднаго канкрэтнага факта, аб якіх некалькі дней пазней гаварылі выступаўшыя ў спрэчках на партсходзе па распрацоўцы рашэнняў пленума ЦК аб нацпытанні. На гэтым агульным і бяззубым артыкуле газета абмежавала сваю барацьбу за ленінскую нацыянальную палітыку, за інтэрнацыянальнае пралетарскае выхаванне.

* *

Кожная шматтыражка і насценная газета павінны пастановы снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б па пытаннях нацыянальнай палітыкі і перавыбараў партыйных органаў палажыць у аснову плана ўсёй сваёй работы, правіваючы ўвесь свой змест наўхільнай, паслядоўнай барацьбой за поўнае і безадкладнае ажыццяўленне гэтых важнейшых партыйных дакументаў.

Дух пралетарскага інтэрнацыяналізма павінен пранізваць сабой кожны радок, увесь змест кожнай шматтыражкі, кожнай насценнай газеты.

Барацьба за ленінскую нацыянальную палітыку, якая з'яўляецца неадрыўнай часткай барацьбы КП(б)Б за ўмацаванне дыктатуры пролетарыята, за пабудову бескласавага сацыялістычнага грамадства—павінна быць у цэнтры ўвагі ўсяго нашага друку, кожнага яго звяна, на раду з усімі іншымі важнейшымі пытаннямі сацыялістычнага будаўніцтва.

Кожная шматтыражка і насценная газета павінны мець моцны бальшавіцкі змест, павінны з усёй непрымірымасцю змагацца супроць маленькіх скажэнняў лініі партыі, змагацца на два франты—супроць правага ўхілу—галоўнай небяспекі на даным этапе, супроць „левых“ загібаў, прымірэнцаў да ўхілаў, супроць рэшткаў контррэвалюцыйнага трацкізма.

Змагаючыся за ленінскую нацыянальную палітыку, за пралетарскі інтэрнацыяналізм,—галоўны агонь па мясцоваму беларускаму нацыяналізму—галоўнай небяспекі ў нацыянальным пытанні на даным этапе ў БССР, разам з тым не паслабляючы самай бязлітаснай барацьбы вялікарускаму шавінізму, рэшткам бундызма, шавінізмам усіх іншых масцей, непаслабная ўвага—пытанням бальшавіцкага правядзення беларусізацыі, сістэматычнай рабоце сярод працоўных нацменшасцяў, справе кожнадзённага выхавання ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізма.

Урокі палітычных памылак шматтыражак «Сцяг індустрыялізацыі», «Панчошніца» павінны быць улічаны усім шматтыражным і насценным друкам Віцебскага раёна.

АБ АРГАНІЗАЦЫЙНЫМ УМАЦАВАННІ КАЛГАСАЎ І ЗАДАЧАХ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

Рэзалюцыя аб'яднанага пленума ГК і ГКК-КП(б)Б па дакладу т. А. Е. БАСКІНА.

На аснове рашэння бюро ЦК КП(б)Б аб становішчы віцебскай парторганізацыі—у рэзультаце праведзенай чысткі радоў партыі віцебская партыйная арганізацыя дабілася некаторых зрухаў у выкананні важнейшых сельска гаспадарчых кампаній (уборка, азімая сяўба, збожжапастаўкі, адгрузка бульбы Ленінграду, зяблівае ворыва і г. д.) і гэтым самым цвёрда стала на шлях выцягнення сельскай гаспадаркі з таго ганебнага прарыва, у якім яна знаходзілася на працягу рада апошніх гадоў.

Разам з тым аб'яднаны пленум ГК і гарКК КП(б)Б прызнае наяўны пералом зусім недастатковым і яшчэ не замацаваным і з усёй рашучасцю падкрэслівае абсалютную правільнасць ацэнкі данай бюро ЦК КП(б)Б і рэспубліканскай камісіяй па чыстцы партыі аб тым, што ў частцы сельскай гаспадаркі, асабліва ў калгасным будаўніцтве, маецца рад буйных недахопаў вельмі адмоўна ўплываючых на арганізацыю, на гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, заблытанасць учота пасеўных і зямельных плошчаў, не праведзена землеўпарадкаванне ў калгасах і аднаасобных гаспадарках, факты надзялення зямлёй калгаснікаў вышэй нормы, слабая работа па вырашчванню і адбору калгаснага актыва і асабліва слабая масавая арганізатарская і выхаваўчая работа з аднаасобнікамі“.

Ганебнае адставанне раёна па абработцы і здачы ільну дзяржаве (асабліва Рудніцкі, Рудакоўскі, Сялюцкі, Замастоцкі сельсоветы), невыкананне бульбазагатовак (Рудакі, Машканы, Вялікія лётцы, Бабінічы), недапушчальнае зацягванне абмалота і засыпкі насенных і страхавых фондаў (Замасточча, Машканы, Доўжа), наяўнасць зусім нязначнай колькасці калгасаў размеркаваўшых ураджай.—Усё гэта з'яўляецца прамым вынікам апартуністычнай практыкі—палітыкі самацёка, гніла-ліберальных адносін у асобных звеннях партыйнай арганізацыі і сельсоветаў.

Аб'яднаны пленум гаркома і гарКК ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Даручыць бюро ГК КП(б)Б забяспечыць безадкладную разработку вытворчых і пасеўных планаў калгасаў з учотам урокаў мінулага сельска-гаспадарчага года, забяспечыўшы актыўны ўдзел шырокага калгаснага актыва ў гэтай рабоце.

Устанавіць, што даводзенне плана да кожнага калгаса праводзіцца толькі на аснове канкрэтнага ведання становішча і ўмоў работ кожнага калгаса і толькі пасля зацвярджэння гэтых планаў гарза з абавязковым удзелам старшынь сельсоветаў і калгасаў, у асобных выпадках брыгадзіраў калгасаў.

Галоўная ўвага ў справе кіраўніцтва калгасамі і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы павінна быць удзелена вытворчай брыгадзе ў калгасе.

Пленум даручае бюро ГК КП(б)Б забяспечыць праз гарза і МТС перагрупіроўку брыгад у асобных калгасах (зямельныя плошчы, цягло, рабочая сіла і г. д.) з тым каб старанна вывучыўшы падрыхтаваць іх да веснавой сяўбы недапускаючы ніякіх змен у брыгадах на працягу ўсяго сельска-гаспадарчага года.

Пленум даручае бюро ГК сумесна з палітаддзелам МТС перагледзець зону дзейнасці МТС і ўнесці неабходныя змены ў тым, каб забяспечыць найбольш эфектыўную і прадукцыйную работу трактарнага парка.

Пленум даручае бюро ГК у найкарацейшы час забяспечыць праз гарза і МТС дакладны ўчот зямельных угоддзяў у разрэзе кожнага калгаса і ўчасткаў аднаасобнікаў, распрацаваўшы цвёрды севазварот для кожнага калгаса ў суадпаведнасці з яго гаспадарчым напрамкам.

Адзначаючы, што да гэтага часу прамое ўказанне ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б аб праўзаліччаных прысядзібных участках у рада калгаснікаў і безадкладным выпраўленнем гэтых скажэнняў лініі партыі па сутнасці яшчэ не праведзена,—пленум даручае бюро ГК безадкладна правесці суцэльную праверку фактычнага землякарыстання і давядзення ўчасткаў да ўстаноўленых норм.

ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎБЫ.

Аб'яднаны пленум рашуча патрабуе ад усёй парторганізацыі ў першую чаргу ад старшынь сельсоветаў, старшынь калгасаў, сакратароў ячэек КП(б)Б безадкладна завяршыць абмалот і засыпку адсартаваных і апрацаваных на ўсхожасць насенных і страхавых фондаў у калгасах, звярнуўшы асаблівую ўвагу на хаванне і недапушчэнне псавання насення, факты якога ўжо наглядаюцца ў асобных калгасах (калгасы імя Гамарніка, Ялагінскага сельсовета, калгас Нікалаеўскага сельсовета, імя Карла Маркса, Сялюцкага сельсовета і г. д.)

Пленум даручае бюро ГК і прэзідыуму гарКК КП(б)Б сумесна з палітаддзелам МТС безадкладна праверыць усе факты псавання насення і іншых сельска-гаспадарчых прадуктаў у калгасах, прыцягнуць вінаватых да строжайшай партыйнай і судовай адказнасці і прыняць практычныя меры, забяспечваючыя насенфонды ад псавання і раскрадання.

Абавязаць гарза і МТС арганізаваць міжкалгасны абмен насення ў суадпаведнасці з пасеўнымі планамі.

Пленум даручае бюро ГК і прэзідыуму гарКК забяспечыць значнае пасіленне работы па падрыхтоўцы конскага пагалоўя да веснавых палявых работ, наўхільна ажыццяўляючы практычныя мерапрыемствы па паляпшэнні конскага пагалоўя, выцякаючыя з правядзення спецыяльнага партдня ў калгасах (8 снежня) па гэтаму пытанню.

Пленум абавязвае фракцыю гарсовета забяспечыць снабжэнне калгасаў нехапаючым сельска гаспадарчым інвентаром, жалезам і запчасткамі для рамонта сельска-гаспадарчага інвентара, безадкладна разгарнуць работу калгасных кузніц і майстэрняў, наладзіўшы сістэматычны кантроль і ўчот за ходам рамонта сельска-гаспадарчага інвентара ў калгасах.

Абавязаць гарза, МТС, усіх старшынь сельсоветаў і калгасаў, дырэктароў калгасаў і совгасаў безадкладна арганізаваць вывазку гною, торфу, вапны ў поле, збор і вывазку попелу і штучных угнаенняў з тым, каб выкарыстаць для гэтай мэты санны шлях.

Пленум рашуча папярэджвае парторганізацыі і сельсоветы супроць недаацэнкі работы з працоўнымі аднаасобнікамі абавязвае ўсе партыйныя арганізацыі раёна на аснове разгортвання масава-палітычнай выхаваўчай работы забяспечыць поўную падрыхтоўку бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па веснавой сяўбе.

Пленум даручае бюро ГК сумесна з палітаддзелам МТС праверыць кіруючыя калгасныя кадры, старшынь калгасаў, брыгадзіраў, загадчыкаў ферм, рахункаводаў, сакратароў партячэек і парторгаў у калгасах, рашуча ачысціўшы калгасы ад класава-варожых і не апраўдаўшых сябе на практычнай рабоце элементаў, больш рашуча высоўваючы правераных, лепшых ударнікаў і ўдарніц калгаснікаў на кіруючую работу ў калгасах.

Даручыць бюро ГК дадаткова падабраць і мабілізаваць групу работнікаў з кіруючага гарпартактыва на пастаянную партыйную гаспадарчую работу ў калгасах і сельсоветах, практычна вырашыўшы пытанне аб паляпшэнні матэрыяльнага забеспячэння работнікаў, накіроўваемых у вёску.

Пленум даручае ГК безадкладна разгарнуць работу па падрыхтоўцы масавых кадраў для вёскі (брыгадзіраў, рахункаводаў, жывёлаводаў, паляводаў і г. д.), разгарнуўшы безадкладна работу калгаснай раённай школы, узяўшы пад сваё непасрэднае назіранне і кантроль над пытаннямі падбора курсантаў, складаннем праграмы і ходам вучобы, з разлікам сканчэння падрыхтоўкі да пачатка веснавой сяўбы.

Пленум даручае бюро пасіліць і перабудаваць шэфскую работу прадпрыемстваў і ўстаноў над сялом у напрамку прымацавання прадпрыемстваў да асобных калгасаў, устанавіўшы адказнасць за гаспадарчае арганізацыйнае палітыка-выхаваўчае і культурна масавае становішча ў калгасе і брыгадзе, як на гаспадарчае і партыйнае кіраўніцтва калгаса, так і на трыкутнік шэфствуючага прадпрыемства.

Пленум лічыць, што перабудова парторганізацыі ў вёсцы ў радзе сельсоветаў праведзена фармальна (Рудніцкі, Шумнянскі і г. д.) і створаныя ў калгасах ячэйкі, парткомсомольскія ядра і парторгі не разгарнулі яшчэ сур'ёзнай і глыбокай партмасавай работы.

Пленум даручае бюро ГК сумесна з палітаддзелам МТС умацаваць калгасы і брыгады, старанна падабранымі парторгамі, забяспечыўшы кіраўніцтва і дапамогу ў іх рабоце.

Разгарнуць партмасавую работу ў калгасах брыгадах, з учотам вывадаў міжраённай нарады па пытаннях перабудовы, паклаўшы ў аснову выкананне калгасам усіх гаспадарча-палітычных задач, разгортванне соцспаборніцтва і ўдарніцтва, правядзенне работы з актывам, жанчынамі і г. д.

Даручыць бюро ГК і фракцыі гарсовета перабудаваць работу сельсоветаў і партарганізацый на сяле ў напрамку рашучага пад'ёма культурна-бытавых умоў работы калгаса і калгаснікаў (чыстата хаты, лазня, парыкмахерская, чырвоны куток, радыё, кіно, тэатральныя пастаноўкі, бібліятэка, газета, яслі, дзіцячыя пляцоўкі і г. д).

Пленум даручае бюро ГК КП(б)Б спецыяльна разглядзець пытанне аб становішчы прыгарадных гаспадарак і падрыхтоўцы іх да сяўбы.

Пленум даручае бюро ГК КП(б)Б прыняць рашучыя меры з тым, каб безагаворачна скончыць засыпку насенных і страхавых фондаў, здачу ільнавалакна, бульбы, гародніны, надзяленне цёлкамі бескароўных калгаснікаў і размеркаванне ўраджаю не пазней 25 снежня 1933 г.

Даручыць бюро сумесна з палітаддзелам распрацаваць мерапрыемствы на скарыстанні зімовага перыода ў калгасах, для цэлага рада дапаможных работ, а таксама на аснове дагавароў, арганізаваць адыходніцтва з калгасаў на важнейшыя гаспадарчыя работы: вывазка торфу, вывазка і разработка лесу, снегабарацьба на чыгунцы, дарбудаўніцтва і інш. работы, гэтым самым умацоўваючы фінансавую і гаспадарчую базу як калгасаў, так і калгаснікаў.

СТАРОНКА № 4 ФАБРЫКІ „КІМ".

Кацельня, пар вырашаюць сення выкананне плана усей фабрыкай.

Даць поўную нагрузку пара баркам і фармоўцы фарбарна-апрэтурнага цэха—справа гонара ўсіх рабочых кацельні, тт. НОВІКАВА, СЕМЯНЧУКОВА, РАБЧЫКА, КОЗІНЦА!

ФАРБАРНА-АПРЭТУРНЫ ЦЭХ ПАВІНЕН АТРЫМОЎВАЦЬ ПАР ПОЎНАСЦЮ. СПЫНІЦЬ РАСТРАНЖЫРВАННЕ ПАРУ.

Фарбарна-апрэтурны цэх завяршае вытворчы працэс усёй фабрыкі „КІМ". Работа гэтага цэха як у люстры адбівае выкананне прамфінплана па ўсёй фабрыцы. Між тым фарбарна-апрэтурны цэх з дэкады ў дэкаду, з месяца ў месяц не выконвае свой прамфінплан. Лістападаўскі план ён выканаў на 63,3 проц., работа за першую дэкаду снежня дала 75,5 проц. плана, а за другую дэкаду снежня 76,1 проц. Дрэнная работа фарбарна-апрэтурнага цэха стварае для фабрыкі затаварванне, стварае напружанае фінансавае становішча фабрыкі. У швейна-кецельным цэху ляжыць каля 90 тысяч дзесяткаў гатовых панчох, якія павінны быць прыняты фарбарна-апрэтурным цэхам для афарбоўкі. У пераводзе на грошы гэта складае каля 630 тысяч руб.

Ляжаць сотні тысяч рублёў мёртвым капіталам. Апрэтурны цэх сістэматычна не выконвае прамфінплан, ён не прымае поўфабрыката для афарбоўкі, бо няма чым фарбаваць—НЯМА ПАРУ. Няма рухаючай сілы, якая прыводзіць у становішча кіпення ваду. Не кіпяць баркі, рабочыя сядзяць без работы. Пры нармальным становішчы барка павінна закіпець 4 разы ў змену, а яна закіпае толькі 2 разы.

Кацельня—гэта рухаючая сіла ўсяго жыцця фарбарна-апрэтурнага цэха, сістэматычна са дня ў дзень не дае патрэбнай колькасці пару. Замест 3,5 атмасфер ціску, яна дае ўсяго толькі ад 1,9 да 3 атмасфер. А бываюць гадзіны, калі кацельня «спрыгвае» да 1 атмасферы, а то і да паловы яе. Калі мы прагледзелі кантрольную кнігу падачы пару з кацельнай і аказалася, што толькі 18 снежня, калі работала група «С» кацельня дала 3,5 атмасферы. Гэта быў выдатнейшы дзень для фарбаршчыкаў. Работа ішла так як трэба.

50 процантная нагрузка барак затрымлівае і астатнія працэсы работы цэха.

Між тым фарбарна-апрэтурны цэх здолен выканаць прамфінплан цалкам Фармоўка можа не толькі „выканаць", але і перавыканаць план. Замест планавых 12 тысяч ста дзесяткаў яна можа даць да 14 тысяч дзесяткаў. Асобныя дні работы цэха, пры нармальнай падачы пару яскрава аб гэтым сведчаць.

У ЧЫМ-ЖА СПРАВА?

Тэхнічнае кіраўніцтва фабрыкі ў твары тав. РАБЧЫКА і кіраўнік кацельнай т. КОЗІНЕЦ тлумачаць такое становішча адсутнасцю паліва. Яны хаваюць сваю нераспараджальнасць за аб'ектыўныя прычыны. Але прычыны хаваюцца па-першае ў растранжырванні пара і ў дрэннай рабоце кацельні.

У трубах ацяплення карпусоў фабрыкі і канторы круглыя суткі цыркулюе пар. Кацельня наганяе многа лішняга цяпла. У канторы, ды і не толькі ў канторы, людзі задыхаюцца ад жары. Расчыняюць нават вокны. А фарбарна апрэтурны цэх у гэты-ж час стаіць. Лішкі пара ў ацяпленні магчыма і трэба пусціць у цэх для таго, каб баркі кіпелі, фармоўка работала бесперабойна. Трэба ўстанавіць графік падачы пара ў магістраль ацяплення, вызначыць для гэтага спецыяльныя гадзіны, а ў астатні час перарываць ацяпленне і падаваць пар выключна ў фарбарна-апрэтурны цэх.

Аб дрэннай рабоце кацельні сведчыць і той факт, што ў час змены рабочых заўсёды ціск пару павышаецца. Змяняючыяся рабочыя імкнуцца пад канец сваёй работы нагнаць пар, каб змену здаць у парадку. Штодзённа амаль кожную змену паўтараецца гэта з'явішча. Гэта яшчэ раз сведчыць аб тым, што і пры гэтым паліве ёсць магчымасць даваць у цэх пару значна больш, чым зараз

Тт. РАБЧЫК і КОЗІНЕЦ павінны неадкладна ўзяцца па дзелавому за ліквідацыю «непаладак» у рабоце кацельнай і ў размеркаванні пару. Партячэйка (сакратар т. НОВІКАЎ) і цэхком (старшыня т. СЕМЕНЧУКОЎ) рамонтнага цэха сюды, у кацельню павінны накіраваць сваю ўвагу, на пар, які па сутнасці справы вырашае выкананне прамфінплана ўсёй фабрыкай.

ФІДЭЛЬМАН, ТУЧЭНКА.

ЗВОДКА

выканання прамфінплана Фабрыкай за 20 дзён снежня. (У процантах да плана).

Назва цэхоў	Выкананне	Трыкутнік
Трыкатажны	199,1	Гантман, Габергруп, Іванковіч
Вязальны	94,8	Іванова, Фанкельштэйн, Пестуновіч
Мотальны	86,9	Каган, Бахрах, Аланіцкая
Швейна-кецельны	76,6	Каган М., Кобрына, Генкіна
Фарбарна-апрэтурны	76,1	Тутуноў, Фідэльман, Кісельгоф
Разам па фабрыцы	76,1	Марушкін, Леўтаў, Вайнштэйн.

ЯКАСЦЬ ПРАДУКЦЫІ.

(У процантах да плана).

	Па плану	Фактычна
ВЯЗАЛЬНЫ ЦЭХ		
ЖАНОЧЫЯ ПАНЧОХІ		
Штопка 1-я	22	20,5
Штопка-брак	0,75	0,5
ДЗІЦЯЧЫЯ		
Штопка	22	100
ФАРБАРНА-АПРЭТУРНЫ ЦЭХ		
Першы гатунак	74,1	35,61
Другі гатунак	16,3	38 8
Першы брак	8,4	23,92
Другі брак	1,2	1,6
Трэці брак	—	0,08

Бюракратызм перашкаджае ажыццяўленню рабочых прапаноў.

На новых мотальных машынах замест нацяжных апаратаў ўстаноўлены тармазныя, што незабяспечвае добра якаснай намоткі і значна зменшае выпрацоўку. Старэйшы майстар цэха тав. Бельчыкаў сканструяваў нацяжны апарат каштоўнасцю ў 3—4 рублі, які значна палягчае работу работніц і дае поўную магчымасць правільна рэгуляваць намотку. Цэхавая адміністрацыя падала кіраўніцтву фабрыкі заяўку на загатаўленне гэтага апарата, але тэхкіраўнік тав Рабчык упарта не дае згоды на загатаўленне рублёвага апарата, які можа зберагчы фабрыцы тысячы рублёў.

Вось другі прыклад. Для паляпшэння пастаноўкі тэхнічнага навучання новых работніц у мотальным цэху т. Бельчыкаў абсталяваў спецыяльную камбінаваную машыну, на якой магчыма перамотваць прадзіва розных укупарак (маткі, бабіны, крэйшпулі) Для гэтай машыны не хапае некалькіх верацён, 48 узлаўлавіцеляй і 48 рэгулятараў. Рабчык замест дзелавога вырашэння гэтага пытання дае распараджэнне таму-ж самаму Бельчыкаву «безадкладна забяспечыць гэту машыну нехапаючымі часткамі». Тав. Рабчык і тут хоча перашкодзіць. Ён канкрэтна не паказвае, дзе ўзяць гэтыя нехапаючыя часткі.

Мы патрабуем ад тав. Рабчыка не займацца пустазвонствам, а па-дзелавому вырашаць пытанні ажыццяўлення рабочых прапаноў.

БЕРМАН, АЛЕНІЦКАЯ, КАГАН, ЮЗЕФАТОВІЧ, СВЯРДЛОВА.

Бракаробы! Па прыкладу Магіт і Юшчанка ударнай работай, поўным знішчэннем брака дабейцеся зняцця з сябе чорнай плямы.

Узняць ярасць мас супроць бракаробаў.

Лічбы зноў кажуць аб тым, што на фабрыцы патрэбнага пералома ў выкананні прамфінплана няма. Некаторае паляпшэнне работы фабрыкі, якое адбілася на павышэнні колькасных паказальнікаў у снежні супроць лістапада—яшчэ не дала патрэбных вынікаў.

Калі па колькасных паказальніках выкананне плана некалькі ўзрасло, то па якасці мы маем як раз наадварот—зніжэнне. У лістападзе першы гатунак складаў 46,5 проц. усёй зданай на базу прадукцыі, а за 2 дэкады снежня ён складае толькі 35,6 проц. Значнае павялічэнне мы маем па выпуску брака. Першы брак узрос на 4,4 проц., другі—на 0,7 проц.

ВЯЗАЛЬНЫ ЦЭХ набліжаецца да поўнага выканання плана. Маюцца дні, калі цэх выконвае прамфінплан звыш чым на 100 проц., але-ж якасць значна адстае, асабліва па дзіцячых панчохах. Тут штопка замест 22 проц. прадугледжаных па плану дасягае 100 проц.

Гэта значыць, што трыкутнік цэха—т т. ІВАНОВА, ФАЛЬКЕНШТЭЙН і ПЕСТУНОВІЧ не ўзялі за правіла сваёй штодзённай работы барацьбу за якасць, па бальшавіцку не мабілізавалі масы на барацьбу за высокаякасную панчоху. Інструктары ў цэху замест таго, каб навучыць уноў прышоўшых работніц выконваюць работу кантралёра

Штодзённа ШВЕЙНА-КЕЦЕЛЬНЫ цэх прымае ад вязальнага тысячы дзесяткаў штопкі. Толькі па віне вязальнага цэха ў швейна-кецельным цэху ляжыць каля 30 тысяч дзесяткаў панчох патрабуючых штопкі. Баявая задача трыкутніка ВЯЗАЛЬНАГА ЦЭХА—разгарнуць бязлітасную барацьбу з бракаробамі і правільна расставіць па вытворчых участках тэхнічную сілу.

НЕ ЛЕПШ СПРАВА Ў ФАРБАРНА АПРЭТУРНЫМ І ШВЕЙНА-КЕЦЕЛЬНЫМ цэхах. У першым пераафарбоўка, дрэнная сартыроўка, падборка і фармоўка ўвайшлі ў сістэму. Кіраўніцтва цэха, як і ў вязальным цэху, не разгарнула бальшавіцкай бязлітаснай барацьбы з бракаробамі. Вось, напрыклад работніцы ЦЫПЛЯКОВА, БЕЗЫЛЯНСКАЯ, МАСІНА і ЛЯХОЎСКАЯ. Яны сістэматычна робяць брак. Супроць іх, як злосных бракаробаў не ўзнята ярасць мас. Перад імі не пастаўлена рашуча пытанне альбо не рабіце браку, альбо ідзіце з сацыялістычнай фабрыкі.

Далей размоў аб бракаробах тут не пайшлі.

На фабрыцы маецца больш 300 комсомольцаў, якія стаяць непасрэдна ля варштата. Пачэсная задача комсомольцаў фабрыкі, кожнага комсомольца паасобку арганізаваць моладзь вакол сябе, адкрыць ураганны агонь па бракаробу.

Але гэтага няма. Няма дастаткова рашучай і паслядоўнай барацьбы з бракаробамі і ў радах комсомольцаў.

Ніводнага комсомольца бракароба і не выконваючага свайго прамфінплана—такава задача павінна быць пастаўлена перад кожнай ячэйкай, перад кожным комсомольцам фабрыкі паасобку. Выкананне гэтай задачы будзе лепшым падарункам комсомольскай арганізацыі фабрыкі XV з'езду КП(б)Б і XVII з'езду ВКП(б).

ЛАДЗЕВА А. С.—злосны бракароб групы «С» швейна-кецельнага цэха. Занесена на чорную дошку.

Ганьба бракаробу.

Вось вінаўнікі дрэннай якасці панчох.

ЧОРНАЯ ДОШКА бракаробаў фарбарна-апрэтурнага цэха.

1. ЦЫПЛЯКОВА—комсомолка, работніца сартыроўкі, групы „С".
2. БЕЗЕЛЯНСКАЯ—работніца сартыроўкі, групы «А».
3. МАСІНА Соня—работніца сартыроўкі, групы „С".
4. ЛЯХОЎСКАЯ Варвара—работніца фармоўкі.

***

ЗНІМАЮЦЦА з ЧОРНАЙ ДОШКІ.

Былыя бракаробы швейна-кецельнага цэха, як выправіўшыяся ў рабоце па хадайніцтву загадчыкаў змен знімаюцца з чорнай дошкі:

1. МАГІТ Хая Барысаўна—работніца кетлёўкі, групы «Б».
2. ЮШЧАНКА Ніна Кірылаўна—работніца аверлок, групы „А".

Просьба зняць з чорнай дошкі.

Работніца швейна-кецельнага цэха тав Магіт Хая Барысаўна занесеная на чорную дошку газетай, як бракароб. За апошні час тав. Магіт у сваёй рабоце значна падцягнулася. План выконвае, штопка ў яе не перавышае планавай. Просьба зняць яе з чорнай дошкі.

Загадчык змены групы «Б» ЧЭРНАМОРДАВА.

Юшчанка больш не бракароб.

Як бракароб работніца швейна-кецельнага цэха т. Юшчанка Ніна Кірылаўна занесена газетай на чорную дошку правільна. Аднак, са дня занясення на чорную дошку т. Юшчанка пачала больш уважліва адносіцца да работы. На працягу апошняга часу мы дасканала праверылі яе работу, але брака не знаходзілі. Зараз тав. Юшчанка работае без брака, прамфінплан выконвае на 100 проц.

Просім газету «Віцебскі пралетарый» зняць тав. Юшчанка з чорнай дошкі, бо яна выправілася, работае па-ударнаму.

Загадчык змены АРЖАНАЯ.
Брыгадзір участка МАРЧАНКА.

Кожнаму лісту рабочага і работніцы, кожнаму допісу рабкора—ВЫЧАРПАЛЬНАЕ рэагаванне.

Бюлетэнь рэагавання на сігналы „Віцебскага пралетарыя".

„ГАЛАВАЦЯПСТВА т. ГЕНКІНАЙ АЛЬБО ЯК УМОВУ ШУКАЛІ ЦЭЛЫ ДЗЕНЬ".

Цэхком швейна кецельнага цэха заметку змешчаную ў „Віцебскім пралетарыі" пад гэтай назвай прызнаў цалкам адпавядаючай сапраўднасці. Цэхком адзначыў зусім недапушчальным тое, што т. Генкіна, як старшыня цэхкома не разгарнула работы па праверцы выканання дагавора па соцспаборніцтву з касцюмным цэхам фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі". Вылучана камісія ў складзе тт. Норкінай, Максімава і Амусінай. Камісіі даручана да 26 снежня зрабіць праверку выканання дагавора, а тав Генкіну абавязалі на сходзе рабочых касцюмнага цэха фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі" зрабіць інфармацыю аб рабоце швейна-кецельнага цэха нашай фабрыкі.

„20 ПРОЦАНТАЎ РАБОЧАГА ЧАСУ ЎХОДЗІЦЬ НА РАЗМОВЫ".

Пры праверцы цэхкомам швейна-кецельнага цэха заметка цалкам пацвердзілася. Цэхком пастанавіў арганізаваць на стале падлёткаў тэхвучобу, вывесіць чорную і чырвоную дошкі. Член цэхкома т. Максімаў прымацаван да стала падлёткаў для правядзення масавай работы.

***

Цэхком прызнаў, што факты прыведзеныя ў заметцы пад назвай „Кожны тэхнічны гурток павінен работаць бесперабойна" адпавядаюць сапраўднасці. Цэхком даручыў адказнаму за тэхвучобу т. Мышкоўскаму сістэматычна сачыць за тым, каб не зрывалася вучоба і падрыхтаваць групу слухачоў для здачы ў бліжэйшыя дні тэхэкзамена на значок «ЗОТ».

„РВАЧ КАШНІКАЎ НАСАДЖАЕ СЯМЕЙНАСЦЬ У ЦЭХУ".

Пры расследаванні заметкі пад гэтай назвай факты рвацтва з боку т. Кашнікава не пацвердзіліся. У адносінах абучэння механікаў факты адпавядаюць сапраўднасці. Цэхком прапанаваў т. Кашнікаву арганізаваць школу механікаў і наладзіць поўнае тэхнічнае абслугоўванне цэха.

Старшыня цэхкома швейна-кецельнага цэха ГЕНКІНА.

„ОРДЭР, ПА ЯКОМУ НІЧОГА НЕЛЬГА АТРЫМАЦЬ".

Бюро парт'ячэйкі швейна-кецельнага цэха пры расследванні заметкі пад назвай „Ордэр, па якому нічога нельга атрымаць" устанавіла, што факт выдачы рабочым цэха пратэрмінаваных ордэроў быў, але не па віне тав. Генкінай, а па віне старшыні фабкома тав. ВАЙНШТЭЙН.

Сакратар партячэйкі КОБРЫНА.

АД РЭДАКЦЫІ.

Гэты ліст тав Кобрынай навочна паказвае яе гнілыя ліберальныя адносіны да вінаўных у здзекванні над работніцамі. Генкіна павінна панесці пакаранне і за тое, што выдавала пратэрмінаваныя ордэры. Мы спадзяемся, што бюро парткалектыва фабрыкі зоймецца гэтай справай і вінаватых прыцягне да партыйнай адказнасці.

ВОСЬ ПРОЗВІШЧЫ ТЫХ, ХТО ЎПАРТА ІГНАРУЕ СІГНАЛЫ НАШАЙ ГАЗЕТЫ.

1 Трыкутнік вязальнага цэха тт. ІВАНОЎ, ФАЛЬКЕНШТЭЙН і ПЕСТУНОВІЧ да гэтага часу не рэагавалі ні на адзін з матэрыялаў змешчаных аб іх цэху ў папярэдніх трох старонках

2 Старшыня фабкома тав. ВАЙНШТЭЙН і загадчык культэктарам фабкома т. АМОНАЎ не рэагавалі на заметкі змешчаныя: у першай старонцы—«Колатаў раз лядаў заяву 32 дні", у старонцы № 3 „У ленкутку.. курылка". „Аб ліквідацыі непісьменнасці запамяталі" і рад іншых заметак.

АД БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВА.

Т.т. ІВАНОВАЙ, ФАЛЬКЕНШТЭЙН, ПЕСТУНОВІЧ, ВАЙНШТЭЙН і АМОНАВУ неабходна сёння з'явіцца на ўнечарговае пасяджэнне бюро парткалектыва, якое адбудзецца ў 6 гадзін вечара.

Яўка абавязкова ў парадку партыйнай дысцыпліны.

Сакратар парткалектыва фабрыкі ЛЕЎТАЎ.

Рабчык і Вайнштэйн не рэагуюць на допісы рабкораў.

У газеце «Віцебскі пралетарый» былі змешчаны артыкулы аб дрэнных адносінах да маладых спецыялістаў і аб тым, што лабараторыя знаходзіцца ў ролі беспрытульнай. Але ўсё засталося па старому. Маладыя тэхнікі працуюць без кіраўніцтва і дапамогі. Ужо пасля змяшчэння артыкула, начальнік вязальнага цэха тав. ІВАНОВА замест дапамогі маладому тэхніку тав. УДАЛЬЕВУ падала рапарт тэхнаруку аб зняцці тав. Удальева з работы, як не адпавядаючы свайму прызначэнню. Жыллёвыя ўмовы тэхнікаў застаюцца надзвычайна дрэннымі. У пакоях ад холаду нават вада замярзае.

Лабараторыя таксама знаходзіцца ў старым становішчы. Прылад набываць ніхто не думае. Тэхкіраўнік фабрыкі тав. РАБЧЫК і старшыня фабкома тав. ВАЙНШТЭЙН ніякіх захадаў не прынялі да знішчэння недахопаў паказаных у гэтых допісах.

Бюро парткалектыва і дырэктар фабрыкі тав. МАРУШКІН павінны неадкладна рэагаваць на допісы і прыцягнуць да адказнасці т.т. Вайнштэйна і Рабчыка за нерэагаванне, за заціск самакрытыкі.

Тэхнік К ч.

АД РЭДАКЦЫІ:

Тэхнарук фабрыкі тав. Рабчык упарта ігнаруе сігналы нашай газеты. Мы патрабуем ад т. Марушкіна прыняцця неадкладных захадаў да ліквідацыі недахопаў паказаных у гэтых допісах і прыцягнення т. Рабчыка да адказнасці.

ХОД СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ БРЫГАДАМІ ДАВЫДАВАЙ, ВАСІЛЁНАК І ЖУКАВАЙ.

Аперацыйная зводка № 3

выканання плана за 20 дзён снежня. (У процантах да плана).

Назва брыгады	Выкананне плана	Брак
НОРКІНАЙ	109,1	2,26
ЖУКАВАЙ	108,9	3 01
ВАСІЛЁНАК	98,6	4,2
ДАВЫДАВАЙ	106,5	5,26

Брыгада НОРКІНАЙ за апошнюю дэкаду снежня работала значна горш чым за першую дэкаду. План выканан на 1,4 проц. ніжэй, брак павысіўся на 0,75 проц.

Брыгада ВАСІЛЁНАК спаборнічае з брыгадай НОРКІНАЙ, падцягнулася і за другую дэкаду работала значна лепш чым у першую дэкаду снежня Яна план выканала на 6,6%, брак знізіла на 38 проц супроць першай дэкады. Не гледзячы на гэтыя дасягненні ўсё-ж брыгада ВАСІЛЁНАК значна адстае ў спаборніцтве з брыгадай НОРКІНАЙ Задача т. ВАСІЛЁНАК, як брыгады ў цэлым у 3 дэкаду снежня не толькі дагнаць, але і перагнаць брыгаду Норкінай па ўсіх паказальніках.

У спаборніцтве брыгад Давыдавай і Жукавай за апошнюю дэкаду адбылася змена. Брыгада ЖУКАВАЙ, якая ўвесь час адставала ад брыгады Давыдавай, дзякуючы ўшчыльненню рабочага дня і ўдарнай рабоце, у апошнюю пяцідзёнку АПЕРАДЗІЛА БРЫГАДУ ДАВЫДАВАЙ ПА ЎСІХ ПАКАЗАЛЬНІКАХ. Выкананне плана ў брыгадзе Жукавай за другую дэкаду снежня супроць першай павысілася на 8,4 проц., брак знізіўся на 0,49 проц. У брыгадзе-ж Давыдавай за гэты час выкананне плана панізілася на 6,5 проц., брак павысіўся. Брыгада Давыдавай ішоўшая раней уперадзе не павінна здаць тэмпаў і свайго першага места ў спаборніцтве з брыгадай Жукавай.

ЗНАЧОК „ЗОТ"—НА ГРУДЗІ ЛЕПШЫМ УДАРНІКАМ.

Аб значку „ЗОТ" ніхто на ўчастку не ведае.

За апошні час навучанне па працэсу сартыроўкі фарбарна-апрэтурнага цэха значна палепшылася.

Дрэнна толькі тое, што тэхучоба ў нас зрываецца з прычыны таго, што кіраўнік гуртка т. БУДЗЬКО на заняткі не з'яўляецца. Аб значку „ЗОТ" ніхто з вучаніц нашага ўчастка не ведае.

Трэба адзначыць, што старшыня цэхавога камітэта т. КІСЕЛЬГОФ і сакратар комсомольскай ячэйкі т. РОДКІНА не клапацяцца аб нармальнай рабоце тэхнічнага гуртка, яны ў дні тэхвучобы прызначаюць розныя сходы і пасяджэнні.

Трыкутнік фарбарна-апрэтурнага цэха (тт. Тутуноў, Фідэльман і Кісельгоф) павінен неадкладна заняцца пытаннем арганізацыі тэхвучобы на падборцы і сартыроўцы.

Мабілізаваная ў лік „300" ЛІБЕНЗОН.

АРЫЯ ГІНЗБУРГА.

Механік ГІНЗБУРГ абавязаўся наладзіць тэхвучобу, але заняткі згадзіўся праводзіць у тым выпадку, калі за гэта яму будзе аплочана.



ГІНЗБУРГ:

Наладзіць тэхвучобу я бяруся,
Перад вамі ў гэтым я клянуся,
Заняткі буду праводзіць,
Але... калі будзеце плаціць.

Ліквідаваць недарэчнасці ў тэхвучобе.

На першы погляд здаецца, што з тэхнічнай вучобай у фарбарна-апрэтурным цэху ўсё ў парадку, але-ж на справе не так. У цэху няма канкрэтнага плана ўсёй работы, а таму тэхвучоба супадае з іншымі відамі вучобы ў цэху і асабліва з заняткамі ў рабочай школе.

Часам абвяшчаюць аб тым, што будзе ўрок тэхвучобы ў рабочай школе, а таму на тэхвучобе застаецца не абавязкова. Прыходзіш у рабочую школу, але там урока па тэхвучобе няма. І так цягнецца блытаніна з тэхвучобай ў цэху ўжо доўгі час. Няўжо цэхком і партячэйка цэха не звернуць на гэта сур'ёзнай увагі і не ліквідуюць недарэчнасці ў тэхвучобай?

Работніца КАРНЕЕВА.

Чакаем умяшацельства дырэктара фабрыкі т. Марушкіна.

Рамонтны цэх увесь час знаходзіцца ў прарыве. Тут узятыя абавязкі па вытворчаму паходу імя тав. Гікала не выконваюцца. У цэху халодна, вокны разбіты. Паравога ацяплення няма, а замест яго на ўвесь цэх пастаўлена адна бляшаная печка. Рабочым прыходзіцца хадзіць па двару фабрыкі і шукаць дровы.

Амаль, што да 9—10 гадзін раніцы ў цэху нельга работаць, бо цёмна. Маючыяся на ўвесь цэх 3 электрычных лямпы не даюць патрэбнай колькасці святла.

Не лепш і з інструментам. Піл, свярлаў, метчыкаў, клупаў і яшчэ многа інструментаў не хапае.

Некалькі разоў аб усіх гэтых недахопах гаварылі загадчыку цэхам т. БАС і старэйшаму майстру т. ЛЫСЮКУ, але справа з месца не рухаецца.

Рабочы рамонтнага цэха КАЗІМІРАЎ.

Рабоце „насадкі" максімум увагі.

Не гледзячы на рад сігналаў у газеце «Віцебскі пралетарый» аб непаладках у рабоце насадкі вязальнага цэха, вынікаў у бок паляпшэння гэтага працэса яшчэ няма.

Інструктары замест навучання работніц займаюцца работай кантралёраў. Частка інструктароў не адпавядае свайму прызначэнню. Адміністрацыяй цэха і ў прыватнасці тав. Гольдзінай, якая з'яўляецца старэйшым брыгадзірам насадкі, не вядзецца ніякай барацьбы з паломкай голак. А імпартных голак з гэтай прычыны, штодзённа ламаецца вялікая колькасць.

Якасць прадукцыі насадкі найгоршая. Штопка на насадцы дасягае 100 проц., замест планавых 22. Гэта ёсць вынік дрэннай вучобы ўноў прыйшоўшых у цэх работніц. Тэхвучоба не наладжана. Арганізацыяй яе ніхто не займаецца.

Насадцы павінна быць удзелена максімум увагі ў арганізацыі работы з боку трыкутніка вязальнага цэха.

Механік ГУТМАН.

Шнейдэр і Каварская парушаюць працоўную дысцыпліну.

Швейна-кецельны цэх адно з вузкіх месц нашай фабрыкі. На ўмацаванне цэха прыслалі маладых тэхнікаў. У асноўным яны сябе на рабоце апраўдалі, узяліся па-ударнаму за працу, за асваенне вытворчасці Але асобныя тэхнікі не зразумелі ўсёй сур'ёзнасці задачы пастаўленай перад імі.

Вось да прыклада тэхнік т. Каварская. Яна цэлымі днямі прасіджвае на скрынках за верстаком, альбо з работніцай Максімовіч ці Вайцэхоўскай праводзіць рабочы час за размовамі.

22 снежня на начной змене Каварская кінула работу і пайшла ў ярус панчох спаць.

Адміністрацыя цэха на такія злачынныя факты не рэагуе. Загадчык змены Шнейдэр хоча гэту справу замазаць, не хоча выносіць «з хаты смецця».

МАШКОЎСКІ, МАКСІМАЎ.

Цыпляковай не месца на фабрыцы і ў комсомоле.

Работніца фарбарна-апрэтурнага цэха Цыплякова сістэматычна дае брак. Зробленую ёю работу амаль заўсёды прыходзіцца даваць другім работніцам для пераробкі.

Як бракароб Цыплякова была занесена ў чорны спіс бракаробаў. З ёю праводзіліся некалькі разоў гутаркі аб яе рабоце, паказвалі, расказвалі ёй, як трэба работаць, каб не рабіць брака. Але яна не жадае прымаць дапамогі, не імкнецца вывучыць свой працэс і сёння працягвае даваць вялікі процант брака. ЦЫПЛЯКОВА З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЗЛОСНЫМ БРАКАРОБАМ І ЁЙ НЕ МЕСЦА НА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ФАБРЫЦЫ. Яна даўно павінна быць звольнена, але загадчык цэхам тав. Тутуноў чамусці ліберальнічае

РАБОТНІЦА К. Д.

АД РЭДАКЦЫІ.

Допіс тав К. Д. правільна сігналізуе аб адсутнасці бальшавіцкай барацьбы комсомольскай арганізацыі не толькі фарбарна-апрэтурнага цэха, але і ўсёй фабрыкі з бракаробамі-комсомольцамі. Мы спадзяемся, што сакратар бюро калектыва КСМ тав. КАГАН улічыць нашы сігналы і прыме захады да мабілізацыі комсомольскай арганізацыі на бязлітасную барацьбу з бракаробамі.

У сталоўцы без змен

Не так даўно на фабрыцы закончыўся дэкаднік па санпаходу, але зруха ў паляпшэнні санітарнага становішча сталоўкі няма. Сталы брудныя, лыжкі дрэнна мыюцца, на іх можна ўбачыць рэшткі стравы.

Яшчэ больш бруду ў сталоўцы ІТР. Горш за ўсё ў сталоўцы фарбарнага цэха. Тут на сталах можна заўважыць рэшткі нават учарашніх абедаў. Падлога брудная. Лыжак не хапае.

Многа разоў аб гэтых агіднасцях гаварылі загадчыку сталоўкі Рысіну, але скаргі застаюцца скаргамі. Пастанова бюро парткалектыва аб паляпшэнні становішча сталоўкі не выканана. Бюро павінна прымусіць т. Рысіна неадкладна і поўнасцю выканаць гэтую пастанову.

Д. і К.

АД РЭДАКЦЫІ:

Мы чакаем ад бюро парткалектыва паведамлення, што зроблена па гэтаму допісу.

Абмен тэлеграмамі паміж т. ЛІТВІНАВЫМ і п. ТЭЎФІК РУШЦЮ-БЕЕМ.

Вялікі нацыянальны сход Турэцкай рэспублікі аднагалосна зацвердзіў канвенцыю аб азначэнні нападаючага бока, якая была падпісана паміж СССР і Турэцкай рэспублікай у Лондане.

Па гэтаму поваду міністр замежных спраў Турэцкай рэспублікі п. ТЭЎФІК РУШЦЮ бей прыслаў прывітальную тэлеграму тав Літвінаву. Тав. ЛІТВІНАЎ звярнуўся з адказнай тэлеграмай да п. Тэўфік Рушцю-бея.

ЗА НЕАДКЛАДНАЕ ВЫЗВАЛЕННЕ ДЗІМІТРАВА, ТОРГЛЕРА, ПАПОВА І ТАНЕВА.

ПАРЫЖ, 26. Па ўсёй краіне працягваецца кампанія за вызваленне тт. ДЗІМІТРАВА, ТОРГЛЕРА, ПАПОВА І ТАНЕВА.

У выступленнях на мітынгах і ў рэзалюцыях падкрэсліваецца, што фашысцкая юстыцыя Германіі, пацярпеўшы паражэнне, імкнецца расправіцца з апраўданымі комуністамі.

«ЮМАНІТЭ» паведамляе, што яна атрымала ТЫСЯЧЫ ТЭЛЕГРАМ ПРАТЭСТА супроць арышта чатырох комуністаў. З прычыны немагчымасці апублікаваць поўнасцю гэтыя тэлеграмы, газета друкуе доўгі спіс іх адправіцеляў.

Бамбардыроўка Фучжоу нанкінскімі самалётамі.

ШАНХАЙ, 26. Нанкінскія самалёты 23, 24 і 25 снежня бамбардыравалі ФУЧЖОУ (правінцыя ФУЦЗЯН). У першыя два дні было забіта 30 чалавек. Бомбы папалі таксама на АЭРАДРОМ і на ЎРАДАВЫЯ установы Фуцзянскай правінцыі. Нанкінскія самалёты таксама бамбардыравалі ЧЖАНЧЖОУ.

Як паведамляе газета „ІЎНІНГ ПОСТ", ЛІ ЦІ-СІН—адзін з кіраўнікоў Фуцзянскага ўрада заявіў, што фуцзянцы рыхтуюцца да ПАХОДА НА НАНКІН.

Падрыхтоўка другога япона-манчжурскага пратакола.

ТОКІО, 26 Камэнтуючы паведамленне газеты „НІЦЫ НІЦЫ" аб прадстаячым падпісанні 1 сакавіка 1934 г. другога япона-манчжурскага пратакола, японскія афіцыйныя колы ўказваюць, што магчыма, прыйдзецца ўдакладніць новыя ўзаемаадносіны паміж Японіяй і Манчжоу Го, якія могуць узнікнуць ў выпадку перамены парадка ўпраўлення ў Манчжоу Го.

Такая перамена чакаецца 1 сакавіка ў сувязі з намячаемым ўзглашэнем цяперашняга главы манчжурскага ўрада ПУ І імператарам Манчжоу-Го.

Аб правядзенні курсаў па перападрыхтоўцы сакратароў калгасных ячэек КСМ.

ПАСТАНОВА БЮРО ГАРКОМА КП(б)Б АД 26 СНЕЖНЯ 1933 Г.

1. Рашэнне ГБ КСМ аб правядзенні месячных курсаў перападрыхтоўкі сакратароў калгасных ячэек ЛКСМБ зацвердзіць.

Прапанаваць старшыням калгасаў і дырэктарам кааппгасаў вызваліць з 30 снежня 1933 г. ад работы таварышоў, выклікаемых на курсы.

2. Прапанаваць ГБ КСМ правесці дэталёвую праверку работы маючыхся у раёне сакратароў ячэек КСМ, на курсы адабраць толькі тых з іх, якія забяспечаць далейшае ўмацаванне комсамольскай работы ў калгасах.

3. У сувязі з гэтым дазволіць ГК КСМ правесці мабілізацыю 15 комсамольцаў - актывістаў горада для сталай работы ў калгасах у якасці сакратароў ячэек, патрабуючых умацавання.

У камісію па адбору ў лік „15" вылучыць ад ГК КП(б)Б тав. АСІНСКАГА.

На курсы перападрыхтоўкі сакратароў калгасных ячэек КСМ, якія пачынаюцца з 1 студзеня 1934 года ГК КСМ выклікае наступных сакратароў калгасных ячэек: Гаўрылюк—совгас Падбярэзе, Янюкевіч—совгас „Новы шлях", Брусіна—совгас імя Сталіна, Ратнер—калгас Дырыжаблы, Буренблат—калгас імя Чарвякова, Рудакоўская сельсовета, Масьюкоў—калгас Старае сяло, Уоцінаў — калгас „Грушанік", Сгара сельскага сельсовета, Шмеркін—калгас імя Сталіна, Машканская сельсовета, Эскін—калгас „Пабеда", Нікалаеўскага сельсовета, Іванькоў—калгас «Шлях Леніна», Канапелька—калгас В.-Чэрніца, Галубцоў—калгас імя Ярслаўскага, Кадчэнка—калгас „Замасточча", Замастоцкага сельсовета, Кавалёнка—калгас «Комінтэрн», Целешоў—калгас «Іскра Леніна», Рагозін—калгас імя Молатава, Ізохватаў—калгас «Новы свет», Барвудоў—калгас „Зорка", Бохін—калгас „Пяці годка ў чатыры гады", Селезнёў калгас «Парыжская комуна», Шумнянскага сельсовета.

ГАРКОМ ЛКСМБ.

Выклік тав. Башмачнікава прымаю.

Прымаю выклік тав. БАШМАЧНІКАВА аб аўладанні да веснавой сяўбы тэхнікай трактара і адпрацоўцы ў веснавую сяўбу ў адным з калгасаў на трактары не менш 5 дзён. У сваю чаргу выклікаю сакратара парткалектыва завода „Чырвоны металіст" тав. СІМУНІНА, дырэктара т. КРАСНОВА, сакратара парткалектыва фабрыкі „Дзвіна" тав. КВІНТА і дырэктара тав. КАПЛАНА.

Заг. агітмасавым аддзелам ГК КП(б)Б ГАЎРЫЛЬЧЫК.

ДЫРЭКЦЫЯ ЦАГЕЛЬНАГА ЗАВОДА № 5 ЗРЫВАЕ ВЫКАНАННЕ ВАЖНАГА ЗАДАННЯ.

Для паліграфічнай майстэрні мастацкага тэхнікума 29 верасня 1933 г. была заказана 10 цагляных ванначак. Адсутнасць гэтых зрывае выкананне клішэ для газеты „Віцебскі пралетарый".

Не гледзячы на неаднаразовыя звароты да дырэкцыі завода, заказ да гэтага часу не выканан і невядома, калі скончыцца цягаціна з яго выкананнем. Пагэтаму я звяртаюся да рэдакцыі газеты, каб уздзейнічаць на кіраўнікоў завода.

Інструктар тэхнікума ПІТКІН.

АД РЭДАКЦЫІ.

Лічым абсалютна недапушчальнымі адносіны дырэкцыі цагельнага завода № 5 да выканання тэрміновага заказа мастацкага тэхнікума. Чакаем ад дырэкцыі неадкладнага выканання заказа і паведамлення аб гэтым.

РАМОНТ ТРАКТАРАЎ—ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА.

Віцебская МТМ павінна зараз-жа узняць тэмпы і якасць рамонта трактарау.

АРГАНІЗАВАЦЬ РАБОТУ РАМОНТНЫХ БРЫГАД.

„САМАЕ ВАЖНАЕ ЦЯПЕР—ПАДРЫХТАВАЦЬ ТРАКТАРЫ ДА ВЕСНАВОГА ВОРЫВА. СЮДЫ ТРЭБА ЗВЯРНУЦЬ ГАЛОЎНУЮ УВАГУ",—так пісала „Праўда" у сваім перадавым артыкуле «Важнейшая задача».

З кожным днём скарачаецца тэрмін, які застаецца да пачатка веснавых работ. Прыблізна праз тры месяцы, не пазней, трактары, наша цягла—выйдуць у поле для напружанай работы па веснавой сяўбе.

Між тым ВІЦЕБСКАЯ МАШЫННА-ТРАКТАРНАЯ МАЙСТЭРНЯ, якая абслугоўвае Віцебскую, Лёзнянскую і Суражскую МТС, а таксама совгасы і калгасы Віцебскага раёна, яшчэ не ўзяла баявых большэвіцкіх тэмпаў у рамонце трактарных матораў.

МТМ мае заданне адрамантаваць да веснавой сяўбы 119 трактараў. У гэтую колькасць уваходзіць 23 трактары Віцебскай МТС, якія рамантуюцца часткова сіламі больш кваліфікаваных трактарыстаў самой МТС. МТМ мае ўсе ўмовы працаваць добра Памяшканні светлыя, вялікія, утульныя. Кваліфікаванай рабочай сілы, па заяве самога дырэктара МТМ тав. ГЕРАВЕНКА, хапае. Пакуль што хапае і запасных частак для трактараў. Але сапраўды большэвіцкіх тэмпаў рамонта трактараў яшчэ няма.

На 25 снежня з рамонта выпушчана толькі 17 трактараў, з якіх толькі 2 апрабавана. Дырэктар МТМ т. Геравенка заяўляе, што снежаньскае заданне Наркамзема будзе поўнасцю выканана (23 трактары—заданне НКЗема на снежань). Але т. Геравенка не ўлічвае таго, што МТМ фактычна заключыла дагаворы на рамонт 119 трактараў. Не ўлічвае ён яшчэ і таго, што рабочыя ўзялі на сябе абавязацельствы ў гонар з'езду партыі скончыць увесь рамонт не да 15, а да 1 сакавіка. Значыцца, лічачы месяц роўным 24 рабочым дням—атрымоўваем, што штодзённа майстэрня павінна выпускаць з рамонта не менш 2 трактараў, а выпускае фактычна 1,5 трактара.

Справа ў тым, што 4 працуючыя брыгады па рамонце трактараў не маюць штодзённых аперацыйных заданняў. У рабочых вялікая ініцыятыва і энтузіязм, але яны не падхопліваюцца ні дырэкцыяй, ні рабачкомам. Спаборніцтва ўдарніцтва абязлічана. У цэхах майстэрні не бачна ні чырвонай, ні чорнай дошкі. Па заяве загадчыка сталовай СОМАВА хаця стол ударніка і існуе, але і ён абязлічан і часам дырэкцыя прымацоўвае да стала ўдарнікаў і неўдарнікаў, без папярэдняга абгаварэння сярод рабочых, на рабачкоме і г. д.

На наша запытанне, якія перашкоды ёсць сёння ў рамонце трактараў—дырэкцыя адказала, што асаблівых перашкод няма і план своечасова будзе выканан.

У гэты-ж час вялікім недахопам дырэкцыя лічыць тое, што не хапае запасных частак для трактараў сістэмы «Фордзон», як поршняў, кольцаў, гільз, але дырэкцыя не прыняла мер да іх набыцця. А між тым адсутнасць гэтых запасных частак можа сарваць тэрміновы рамонт трактараў. Не хапае і шарыкападшыпнікаў.

Што патрэбна зрабіць, каб паспяхова справіцца з рамонтам трактараў, які ўпаўне магчыма скончыць да 1 сакавіка? Правільна арганізаваць работу рамонтных брыгад, даючы ім штодзённыя аперацыйныя заданні, наладзіўшы кантроль над іх выкананнем. Неадкладна набыць нехапаючыя запасныя часткі для «Фардзонаў», каб яны не былі перашкодай у бесперапынным рамонце. Узначаліць творчую актыўнасць рабочых майстэрні, весці дакладны улік соцспаборніцтва ў брыгадах па рамонту. Мець цесную сувязь і наладзіць абмен вопытам з спаборнічаючай гомельскай МТМ. Наладзіць улік ударнікаў майстэрні, забяспечыць, каб ударнікі атрымоўвалі лепшыя абеды ў сталоўцы, каб яны сапраўды адчувалі, што аб іх, як аб сапраўдных ударніках, дырэкцыя і грамадскія арганізацыі майстэрні праяўляюць клапатлівасць.

Толькі так працуючы, віцебская МТМ, узяўшы на сябе ганаровы абавязак у адзнаку надыходзячых з'ездаў партыі здолее справіцца з ускладзенай на яе адказнай задачай—адрамантаваць высокаякасна да 1 сакавіка 119 сталёвых коняй для надыходзячай веснавой пасеўнай кампаніі.

ХОД РАМОНТА ТРАКТАРАЎ ПА ВІЦЕБСКАЙ МТМ НА 25 СНЕЖНЯ 1933 Г.

Заданне.	Адрамант.	Проц вык.
119	17	14,2

Апрабаваны 2 трактара.

Справа барацьбы за добрую дарогу—справа усей пролетарскай грамадскасці раена.

ВІЦЕБСКІ РАЕН ПАВІНЕН МЕЦЬ ДОБРЫЯ, КУЛЬТУРНЫЯ ДАРОГІ.

БССР І ЧУВАШСКАЯ АССР заключылі дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва па ліквідацыі бездарожжа. Асноўнае ў дагаворы—па-баявому разгарнуць будаўніцтва культурных дарог і забяспечыць іх добрае ўтрыманне.

Заваяваць першынства ў спаборніцтве з Чувашыяй—важная, баявая задача. А дабіцца гэтага магчыма толькі тады, калі за культурную дарогу будуць змагацца УСЕ арганізацыі, уся грамадскасць.

Між тым падрыхтоўка да дарожнага будаўніцтва 1934г ў Віцебскім раёне праходзіць зусім нездавальняюча. Марудна праходзіць вывазка камення. Віцебскі раён мае заданне па працудзелу 4076 конедзён, на 25 снежня адработана (па Учдору 701 2.076 конедзён)

Сельсоветы недаацэньваюць надзвычайнай вялікай важнасці своечасовага выканання плана дарбудаўніцтва. Так, прыкладна, БАРАЎЛЯНСКІ сельсовет (старшыня т. КУРАКОЎ) павінен вывезці на працягу часу ад 15 снежня да сакавіка 1934 года 2.557 кубаметраў камення на трасу. На сёння гэты сельсовет не вывез ніводнага кубаметра Сельсовет нават не даваў кормы вывазкі да кожнага калгаса і працоўнага аднаасобніка. Яны нават не ведаюць аб сваіх задачах у галіне дарбудаўніцтва

Сельсовет павінен штодзённа прадастаўляць 60 падвод для вывазкі камення. За час з 15 снежня па 25 сельсовет даў усяго 9 падвод.

Старшыня калгаса імя Леніна т. БЕЛЬКОВІЧ, (Бараўлянскі сельсовет) і старшыня калгаса „ЗОРКА" гэтага-ж сельсовета тав. БАГДАНАЎ не далі на вывазку камня ніводнай падводы.

ДАЎЖАНСКІ сельсовет (старшыня т. ПІСКУНОЎ) павінен штодзённа прадастаўляць 87 падвод, а не прадастаўляе ніводнай. З снежаньскага задання у 388 кубаметраў камення, сельсовет яшчэ не вывез ніводнага кубаметра.

Калгас „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" (старшыня ЦЯРЭШЧАНКА) і калгас «СІЛАЧ» (старшыня РЭМІЦАН) таксама не прыступілі да выканання снежаньскага задання.

Горш за ўсіх справа абстаіць з ВІЦЕБСКІМ СЕЛЬСОВЕТАМ (старшыня т. КРЫШЧОНАК). За ўвесь час гэты сельсовет не вывез ніводнага кубаметра будматэрыялаў.

Такім чынам ніводзін сельсовет Віцебскага раёна не выканаў поўнасцю заданне па вывазцы дарбудматэрыялаў.

Трэба адзначыць нядбайна-несур'ёзныя адносіны адказнага за дарбудаўніцтва загадчыка планавым аддзелам гарсовета т. АНТАНОВІЧА. Сельсоветы невыкананнем заданняў па працудзелу зрываюць дарбудаўніцтва 1934 года, аднак тав. Антановіча гэтае становішча не турбуе і ён ніякага не прадпрымае для таго, каб сельсоветы выканалі важнейшую дырэктыву партыі і ўрада аб дарбудаўніцтве.

Віцебскі раён павінен мець добрыя, культурныя дарогі. У парадку падрыхтоўкі да XVII з'езда партыі Учдор 701 узяўся загатовіць 9 900 кубаметраў камення, што павінна поўнасцю забяспечыць будаўнічы сезон 1934 г. і вывезці 7 400 кубаметраў.

Дарожныя майстры Учдора 701 у адзнаку падрыхтоўкі да XVII з'езда партыі ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы забяспечыць вывазку 75 проц. колькасці камня на трасу, забяспечыць атрыманне і вывазку лесаматэрыялаў для мастоў, завяршыць рамонт дарожных будынкаў і многа інш. абавязацельстваў

Гэтыя абавязацельствы, узятыя на сябе Учдорам 701 у цэлым і дарожнымі майстрамі паасобку, павінны быць выкананы ў вызначаныя тэрміны. Для гэтага патрэбна неадкладна разгарнуць масавую работу сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, давесці да кожнага з іх планы дарбудаўніцтва.

Справа барацьбы за поўнае выкананне плана дарожнага будаўніцтва павінна быць ператворана ў справу ўсіх арганізацый, усёй пролетарскай грамадскасці Віцебскага раёна.

Да 1 студзеня ліквідаваць бескароўнасць калгаснікаў.

З вялікай радасцю бескароўная калгасніца НАВІЦКАЯ атрымала выданую ей цялушку.

МАЯ ДУМКА АЖЫЦЦЯВІЛАСЯ.

Доўгі час я думала як-бы набыць хаця-б маленькую цялушку, ужо не гаворачы аб 8-месячнай.

Але ж ніякіх магчымасцяй для гэтага ў мяне не было. Да і дзе там сабрацца з грашыма—я ўдава, адна толькі ў калгасе работаю, на маім утрыманні двое малых дзяцей.

Паглядзіш у людзей ёсць каровы. Дзеткі іх малачко п'юць, а тут рэдка, рэдка бачыш у вочы хаця-б літр малака.

Неяк яшчэ вясной я пачула аб тым, што большэвіцкі правадыр—наш любы таварыш Сталін гаварыў, каб не было ў нас бескароўных калгаснікаў.

І вось нарэшце з дапамогаю калгаса 22 снежня я атрымала 8-месячную цёлку. Я вельмі задаволена гэтым, не нахаджу нават слоў, каб гэта ўсё перадаць

Дзякую партыю, совецкую ўладу, тав. Сталіна за вялікую дапамогу.

Былая бескароўная калгасніца калгаса „Замасточча", Замастоцкага сельсовета НАВІЦКАЯ.

Калгаснікі-ўдарнікі атрымліваюць цёлак.

Праўленне калгаса імя Калініна Машканскага сельсовета, у адзнаку надыходзячых з'ездаў партыі вадзяліла сваіх бескароўных калгаснікаў ударнікаў цёлкамі.

Першую цёлку атрымаў брыгадзір тав. ХАМА С.—былы беднак, які ніколі ў жыцці не меў сваёй каровы

Атрымала цёлку і калгасніца Шалкова Мар'я—былая батрачка-дэлегатка 2 раённага з'езда калгаснікаў-ударнікаў. Майстра калгаса Абель Карл таксама атрымаў цёлку.

МЯЖЭВІЧ.

ЗМАЗВАЮЦЬ ПАЛІТЫЧНЫ СЭНС СПРАВЫ.

З 42 бескароўных калгаснікаў па Замастоцкаму сельсовету на 25 снежня надзелены цёлкамі—32. Большасць з бескароўных калгаснікаў ніколі не мела кароў.

Поўнасцю ліквідавалі бескароўнасць сярод сваіх калгаснікаў калгасы «Праўда», імя Варашылава, «Шчамілаўка», „Чырвоны араты", „Чырвоная зорка" і імя Яраслаўскага.

З вялікай радасцю бескароўныя калгаснікі, атрымаўшыя цёлак, расказваюць аб тым, як іх шматгадовая думка—мець карову, ажыццявілася.

Вось, напрыклад, калгасніца-ударніца калгаса „Замасточча" Хранюк Сцепаніда, былая батрачка. Для яе атрыманне цёлкі з'явілася вялікай падзеяй, вялікім святам. Выдача цёлкі яшчэ больш узняла зацікаўленасць да работы ў калгасе.

Другая калгасніца гэтага-ж калгаса—Навіцкая таксама з вялікай радасцю апавядае аб тым, што яна ўжо больш не бескароўная. У яе добрая цёлка, якая хутка стане каровай.

Гэтыя факты яркае пасведчанне таго аграмаднейшага гаспадарча-палітычнага значэння, якое мае дапамога бескароўным калгаснікам.

Але ў калгасе „Замасточча" яшчэ вялікі прарыў у дапамове бескароўным калгаснікам. З 13 бескароўных цёлак атрымалі толькі 3. Старшыня калгаса Якімаў гаворыць, што не яго справа займацца надзяленнем цёлкамі. А сакратар партячэйкі Барсукоў зусім у баку ад гэтай справы. Праўленне калгаса без усякіх падстаў выкрэсліла са спіса бескароўных трох калгаснікаў, якім патрэбна дапамагчы набыць цёлак.

Наадварот у калгасе ёсць выпадкі залічэння ў спіс бескароўных калгаснікаў такіх, якім нельга выдаць цёлак. Так, праўленне залічвае ў спіс на атрыманне цёлкі выключанага з калгаса „Іскра Леніна", Шумнянскага сельсовета, і яшчэ не прынятага ў калгас нейкага Кавалёва.

ГРЫНМАН.

ПАВЕДАМЛЕННІ.

— Сёння, 29 снежня адбудуцца пасяджэнні пленумаў секцый гарсовета.

КОМУНАЛЬНАЙ—у 7 гадзін вечара ў памяшканні клуба трамвайшчыкаў;

ТРАНСПАРТНАЙ—у 7 гадзін вечара ў памяшканні аргаддзела гарсовета;

ВАЙСКОВАЙ—у 7 гадзін вечара ў памяшканні гарсовета (пакой 28, сумесна з партызанамі.

ПРАЦЫ І ЗАБЯСПЕКІ— у 7 гадзін вечара ў памяшканні гарсовета (пакой № 6).

— 30 снежня ў 6 гадзін вечараў памяшканні гарсовета (пакой 28) адбудзецца нарада членаў гандлёва-КААПЕРАЦЫЙНАЙ і АХОВЫ ЗДАРОЎЯ СЕКЦЫЙ ГАРСОВЕТА, а таксама членаў гарсовета, працуючых у харчовай прамысловасці і сталоўках, дырэктароў прадпрыемстваў і загадчыкаў сталовак па пытанню аб выкананні дырэктыў ЦК ВКП(б) аб становішчы харчовай прамысловасці.

АРГАДДЗЕЛ ГАРСОВЕТА. ГАРСНАБ.

— Сёння, 29 снежня 1933 г., у 7 гадзін вечара ў памяшканні ГК ЛКСМБ склікаецца нарада брыгадзіраў комсомольска-маладзёжных брыгад, эканомработнікаў цэхічзек-калектываў, кіраўнікоў тэхнічнай вучобы і камісія па прыёму тэхнічнага экзамена, па пытанню аб ходзе спаборніцтва вытворчых брыгад на права падпісання рапарта з'езду партыі.

ГК ЛКСМБ. „ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ".

— Вучотны аддзел гаркома КП(б)Б паведамляе, што згубленыя наступныя партдакументы лічыць несапраўднымі: Воопава—п-б № 1107304, Пах Б. М.—п-б № 0801722, Усоіс І. А.—п-б № 0803378, Шэйкін Я. Л.—п-б № 240... Каган Г. М. п-б №1625982, Баранчук М. П. —г-к № 78362.

ВУЧСТАТАДДЗЕЛ ГК КП(б)Б.

ВІЦЕБСКІ ГАРФА АБВЯШЧАЕ ЎСІМ САМАТУЖНІКАМ г. ВІЦЕБСКА І РАЁНА,

што выдача рэгістрацыйных пасведчанняў на 1934 год будзе вытварацца ў памяшканні гарфа (пакой № 8) з 10 гадзін раніцы да 7 гадз. вечара, пачынаючы з 27 снежня г. г. у наступным парадку:

Гадзіншчыкам, кавалям, бляхарам, слесарам, краўцам, краўчыхам і белашвейкам—27 снежня 1933 г.; шаўцам—28 снежня; усіх іншых прафесій—29 і 30 снежня; лёгкавым і ламавым фурманам—31 снежня 1933 г. і 1 студзеня 1934 г.

Рэгістрацыйныя пасведчанні атрымоўваюць асобы, якія непасрэдна займаюцца саматужным промыслам. Патрэбна мець пры сабе дамавую кнігу і марак адзінай дзяржаўнай мыты на 10 р. (якія набываюцца ў Дзяржбанку). Легкавыя і ламавыя фурманы павінны адначасова з атрыманнем рэгістрацыйных пасведчанняў выбраць нумарны знак коштам у 2 р. і ўплаціць падатак за каня—20 р.

Тэхнічная праца па запаўненні рэгістрацыйных заяў будзе вытварацца супрацоўнікамі гарфа.

Папярэджаецца, што за несвоечасовую выбарку рэгістрацыйных заяў вінаватыя будуць штрафавацца.

Загадчык гарфа ОРДЫНЦАЎ. Інспектар ЭПШТЭЙН.

1162—5—2

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР — 3-ці Беларускі Дзяржаўны тэатр.

29, 30 СНЕЖНЯ.

Н. ПАГОДЗІН.

МОЙ ДРУГ

Пачатак у 8 з паловай гадз. вечара. Білеты прадаюцца ў касе тэатра.

Кіно „1 МАЯ" — З 27 снежня новы гукавы мастацкі фільм КАІН І АРЦЕМ

Кіно „СПАРТАК" — З 27 снежня замежны фільм КАЛІ РАСТАЕ СНЕГ З удзелам МЕРЫ ПІКФОРД

«ПРАЛЕТКІНО» — З 24 снежня замежны фільм СЯБРОЎКА МАРАНА (Любовь и долг) Звыш праграмы кіно-хроніка № 8 вып. 1933 г.

МІЖРАЕННАЯ КАНТОРА „ЗАГАТЗЯРНО"

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА КАЛГАСАЎ І АДНААСОБНІКАЎ РАЁНА, здаўшых салому непасрэдна ваенным часцям па часовых квітках, ШТО ІМ НЕАБХОДНА ДА 29 СНЕЖНЯ Г. Г. З'ЯВІЦЦА Ў ВІЦЕБСК (Смаленскае шасе № 68), АБО ЧЭПІНСКІ СЕННЫ ГАРАДОК для абмена на квіткі Загатзярно і атрымання грошай па іх.

Да сельсоветаў просьба садзейнічаць абмену квіткоў да паказанага тэрміна, бо часовыя квіткі не залічаны ў план выканання.

1177—3—1 МІЖРАЙКАНТОРА ЗАГАТЗЯРНО.

БАЗА БЕЛДЗЯРЖСНАБА ПАВЕДАМЛЯЕ, што 30 і 31 снежня 1933 г. база працуе як звычайна.

ВЦРК арганізуе ВЯЛІКІ НОВАГОДНІ БАЗАР у памяшканні чайнай (рог) Вагзальнай і Канатнай вул.

Будзе ВЯЛІКІ АСАРТЫМЕНТ АБУТКА, ГАТОВАГА АДЗЕННЯ, МАНУФАКТУРЫ, ТРЫКАТАЖА, ГАЛОШ, БАКАЛЕЙНА-ГАСТРАНАМІЧНЫХ ТАВАРАЎ І ІНШ.

На базары будзе аркестр.

БАЗАР АДБУДЗЕЦЦА З 29 СНЕЖНЯ 1933 г. ДА 2 СТУДЗЕНЯ 1934 г.

1184—4—1. ПРАЎЛЕННЕ ВЦРК.

Віцебскі гарадскі фінансавы аддзел, на падставе пастановы НКФ СССР ад 7 IX 30 г. № 624 прапануе ўсім віжэйпералічаным прадпрыемствам і арганізацыям, якія знаходзяцца на тэрыторыі горада Віцебска і прыгараднага раёна і якія абавязаны тымі ці іншымі плацяжамі ў бюджэт, ЗАРЭГІСТРАВАЦЦА Ў ГАРФІНАДДЗЕЛЕ НА 1934 ГОД, шляхам падачы рэгістрацыйнай заявы па ўстаноўленай форме. ТЭРМІН РЭГІСТРАЦЫІ—ДА 1 СТУДЗЕНЯ 1934 ГОДА. РЭГІСТРАЦЫІ ПАДЛЯГАЮЦЬ: прадпрыемствы дзяржаўнай і комунальнай прамысловасці, фабрыкі, заводы, майстэрні, арганізацыі саматужна-прамысловай, інваліднай і спажывецкай кааперацыі, АРС'ы, сельСТ, прадпрыемствы дзяржгандля, транспартныя арганізацыі, будаўнічыя канторы пры ўсіх пабудовах, аб'яднанні, трэсты, базы, склады, розныя філіялы, канторы, снабзбыты, прадпрыемствы грамадскіх арганізацый, таварыствы, навучальна-вытворчыя ўстановы і фабзавучы, прадпрыемствы калгасаў, совгасаў і усе сельскія гаспадаркі пры арганізацыях, прадпрыемствах, установах і ваенных часцях, адкрытыя прадпрыемствы для прыняцця яды і напіткаў, буфэты і усе зачыненыя сталоўкі, дзе прадаюцца піва, папяросы і канцытарскія вырабы, а таксама ўсе іншыя арганізацыі, якія займаюцца прамысловай і гандлёвай дзейнасцю.

Прадпрыемствы з разгалінаванай сеткай да рэгістрацыйнай заявы прыкладаюць спіс аперацыйных адзінак.

Тыя з пералічаных арганізацый і прадпрыемстваў, якія абкладаюцца падаткам са зварота, бюджэтнымі нацэнкамі і інш. плацяжамі ў цэнтралізаваным парадку Наркамфінам БССР або фінорганамі іншых гарадоў і мясцовасцяй СССР, абавязаны замест рэгістрацыйнай заявы прадставіць фінаддзелу не пазней 10 СТУДЗЕНЯ 1934 года даведку па форме № 4.

Рэгістрацыйных заяў не прадстаўляюць толькі тыя адзінкі мясцовага значэння, звароты якіх абкладаюцца віцебскім гарфінаддзелам у складзе ўсёй арганізацыі, куды уваходзяць гэтыя адзінкі (напрыклад крамы Горрабкоопа, ЗРК, АРС'аў, Белгандля і інш.).

Бланкі рэгістрацыйнай заявы і бланкі — даведкі ф. № 4 выдаюцца ў гарфінаддзеле (Совецкая вул. дом № 32, пакой № 9).

За ўхіленне ад рэгістрацыі вінаватыя будуць штрафавацца да СТА рублёў.

1187—2—1 ВІЦЕБСКІ ГАРФІНАДДЗЕЛ.

У сувязі з прадстаячымі XV з'ездам КП(б)Б і Віцебскай раённай партыйнай канферэнцыяй прыём падпіскі на менскія газеты і часопіс („Звязда", „Чырвоная змена", „Акцябр", „Орка", „Большэвік", „Большэвік Беларусі" і інш.) і на газету „Віцебскі пролетарый" на 1934 год ПРАЦЯГНУТ ДА 2 СТУДЗЕНЯ.

Спяшайцеся падпісацца, каб не застацца на студзень без газет і часопісаў.

1188 ГАРБЮРО САЮЗДРУКА.

УСІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ І КААПЕРАЦЫЙНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ І ПРАДПРЫЕМСТВАМ.

На падставе ўзгадненняў паміж ваенна-будаўнічым аддзелам ВВА і ўсесаюзным трэстам Наркомснаба СССР «Госторгтара», лесакамбінат ВСО, ВВА ПЕРАДАН з усім актывам і пасівам трэсту «Госторгтара» і ім рэарганізуецца ў камбінат пад назвай «Віцебскі тарны камбінат трэста «Госторгтара».

Разліковыя бягучыя рахункі ў Віцебскім аддзяленні Дзяржбанка за №№ 150|1929 і 150|2042 зачынены, а замест іх адчынен бягучы рахунак № 55|2114.

Усе асобы і ўстановы, якія маюць прэтэнзіі да лесакамбіната ВСО, абавязаны заявіць іх да 5 студзеня 1934 года, пасля якога тэрміна ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.

Зарэгістраваныя адрасы тарнага камбіната наступныя:

Паштовы: г. Віцебск, 2-я Маркаўшчына, Віцебскаму тарнаму камбінату „Госторгтара".

Тэлеграфны: Віцебск, таракамбінат.

Чыгуначны: Раз'езд Мядведка, МББ чыг., Віцебскаму тарнаму камбінату „Госторгтара".

Тэлефон: Маркаўшчына, 33.

1156—3—2 ЗАВОДАКІРАЎНІЦТВА.

ДЫРЭКЦЫІ ВІЦЕБСКАГА ХАЛАДЗІЛЬНІКА патрэбен вопытны бухгалтар. Плата па згодзе. Адрас: 1 Пролетарская слабада, вул. Будзённага, 47, 1181—1—1 Халадзільнік.

У сувязі з рэвізіяй кладовых, гарашчадкаса № 32 2-е і 3-е АДДЗЯЛЕННІ, 30 і 31 снежня будуць зачынены.

1180 ГАРАШЧАДКАСА № 32.

ЦАГЕЛЬНАМУ ЗАВОДУ № 2 І КЕРАМІЧНАМУ № 1 «БЕЛБУДМАТЭРЫЯЛ» г. ВІЦЕБСКА патрэбен ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР на сталую працу.

Аплата па згодзе, пажадана знаёмства з керамічнай вытворчасцю. Звяртацца: Суражскі зав. № 6, кантора заводаў, тэл. № 4-42

1185—2—1

Згубленую КРУГЛУЮ ПЯЧАТКУ завкома спірта-водачнага завода лічыць несапраўднай.

1182—1—1

ВЫТВАРАЕЦЦА ЗАКУПКА САБАК пароды „нямецкая аўчарка". З прапановамі звяртацца ў гарсовет АСОахіма (Палац працы, пакой № 5) з 28 да 31 снежня г. г. Прывод і агляд сабак з 28 да 31 снежня з 9 да 1 гадзіны дня і з 5 да 8 гадз. вечара.

1186—3—1

Паліклініка камітэта ўзаемадапамогі паведамляе, што ўсе заказы на зубапратэзныя работы са свайго матэрыяла і з матэрыяла паліклінікі, зданыя ў 1931 і 1932 годзе і не атрыманыя заказчыкамі да 4 студзеня 1934 г., анулююцца. Пасля гэтага тэрміна ніякія прэтэнзіі заказчыкаў прымацца не будуць.

1189

ДРУКАРНІ „КОМІНТЭРН" патрабуюцца для навучання вучні на высокакваліфікаваных наборшчыкаў і разборшчыкаў ад 18 год, з адукацыяй 6—7 груп. Звяртацца Большэвіцкая, 10. ДЫРЭКЦЫЯ.

Адказны рэдактар А. М. КУРЦІК.